Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЖНІЎНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 163 (28273)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Крэдыт на будаўніцтва — пад 17 %

СТАР. 3

Сямейная газета

Калі бабуля — клаўнеса

Якія зёлкі збіраць у верасні?

ЛІЧБА ДНЯ

745,8 рубля

склала ў краіне налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў за ліпень 2016 года (у чэрвені — 738,7 рубля з улікам дэнамінацыі), паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у ліпені гэтага года складала 748,1 рубля (у чэрвені — 741,7).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2016 г.

Долар ЗША		1,9522 ▲
Еўра		2,2030 ■
Рас. руб.		0,0300 ▲
Укр. грыўня		0,0769 ▲

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 16163>

СЭЛФІ НА ДАРОЖКУ

Гэтымі днямі Дзяржаўтаінспекцыя Брэсцкай вобласці праводзіць цікавую акцыю — конкурс на лепшае фота з супрацоўнікам ДАІ. Дэвіз у такой імправізаванай фотаздымкі адзін: «Я і ДАІ — разам за бяспеку на дарогах!» Берасцейцы з прыхільнасцю паставіліся да гэтай ідэі, прывабленыя абяцанымі прызамі пераможцам і магчымасцю зрабіць фота з незвычайным сюжэтам. Сям'я ШЧАРБАКОВЫХ, напрыклад, спынілася, каб зрабіць сэлфі з інспектарам ДПС Андрэем ХВЕСЮКОМ.

Фота БЕЛТА.

ЯДНАННЕ НЕБА І ЗЯМЛІ

Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга рушыць з Мінска ў Рагачоў 31 жніўня

Яна пройдзе ў нашай краіне ўжо 23-ці раз і па традыцыі ў першую нядзелю верасня, у сталіцы Дня беларускага пісьменства горадзе Рагачове адбудзецца пасадка Саду Малітвы. Божая літургія ў храме Святога Аляксандра Неўскага пачне і благаславіць галоўны дзень мерапрыемстваў гэтага знакавага дзяржаўнага свята.

— Па сутнасці, навукова-асветніцкая экспедыцыя — акадэмія на колах, асвечаная Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга, — кажа ***ініцыятар заснавання экспедыцыі, кіраўнік дваццаці адной экспедыцыі, ганаровы кіраўнік сёлетняй, заслужаны работнік культуры, пісьменніца Ніна ЗАГОРСКАЯ.*** *— Дзве святыні ў нашым перасоўным храме на колах: Непагасная Лампада Духоўнасці з Дабрадатным Агнём, які прайшоў у 1992 годзе праз праваслаўныя святыні ўсіх славянскіх дзяржаў з Іерусаліма ў Маскву на Міжнароднае Свята славянскага пісьменства і славянскіх культур пад дэвізам «Адзінствам і любоўю ўратуемся». Гэта словы благаслаўлення Сергія Раданежскага Дзмітрыю Данскому на Кулікоўскую бітву. У гэтых словах — сэнс і змест экспедыцыі. На гэта скіраваны хрэсныя ходы да праваслаўных святыняў — храмаў, манастыроў, капліц, дзе адбываюцца малебны і перадача Дабрадатнага Агню на свечкі прыхаджан. На гэта скіравана пасадка Садоў Малітвы — пад кожнае дрэўца падсыпаецца асвечаная зямля з усіх адрасоў на маршрутах усіх штогадовых пяцідзённых экспедыцый — а гэта да сямнаццаці гарадоў, пасёлкаў і вёсачак штогод.*

СТАР. 13

І стала жудаснаю ноч

У Італіі магутны землятрус: колькасць загінулых расце

Удар падземнай стыхіі адбыўся ў цэнтральнай Італіі ў ноч на сераду, 24 жніўня, што прывяло да сур'ёзных разбурэнняў у некалькіх гарадах.

Ваганні зямной паверхні адчуваліся ў шэрагу гарадоў цэнтральнай Італіі, у тым ліку ў Рыме і Балонні. Паводле інфармацыі, якая паступае, разбурэнні адбыліся як мінімум у трох правінцыях — Асколі Пічэна, Ферма і Мачэрата (вобласць Марке).

Колькасць ахвяр працягвае расці. Спачатку паведамлялася пра шэсць загінулых, потым гаворка ішла пра 14 ахвяр. Па апошніх звестках мясцовых СМІ, у выніку землятрусу загінулі 84 чалавекі. Невялікі горад Акумолі, за два кіламетры ад якога знаходзіўся эпіцэнтр землятрусу, напалову разбураны, шмат людзей знаходзіцца пад завалами, паведаміў мэр горада Стэфана Петручы. «Разбурэнні закранулі казарму карабінераў, цэрквы і многія жылыя дамы. У многіх месцах адсутнічае тэлефонная сувязь. Зараз сюды прыбылі ратавальнікі. У цэнтры горада вядуць работу групы пажарных», — сказаў мэр.

Інфармацыі аб наяўнасці грамадзян Беларусі сярод ахвяр землятрусу ў Італіі няма. Пра гэта гаворыцца ў твітэр-акаўнце пасольства Беларусі ў Італіі. Адзначаецца, што пасольства старанна адсочвае сітуацыю ў сувязі са стыхійным бедствам у цэнтральнай Італіі.

Раней у МЗС папрасілі грамадзян, чые родныя знаходзяцца ў пацярпелых ад землятрусу раёнах Італіі і не выходзяць на сувязь, паведаміць пра гэта па тэлефоне +393454803465.

■ Парламенцкі дзённік

ЯК ДАПАМАГЧЫ РАЗВІЦЦЮ КРАІНЫ?

За кошт заканадаўчай базы

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбылося пашыранае пасяджэнне Прэзідыума верхняй палаты беларускага парламента з удзелам прэзідыумаў абласных Саветаў дэпутатаў, а таксама вышэйшых службовых асоб, кіраўнікоў. На парадку дня адно пытанне — як члены Савета Рэспублікі змогуць паспрыяць рэалізацыі прыярытэтаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады.

Значную ролю ў паляпшэнні эканамічнага стану краіны могуць адыграць менавіта члены Савета Рэспублікі, лічыць яго старшыня Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. «Пры гэтым мы не павінны выконваць функцыю выканаўчай улады і выканаўчай вертыкалі ў цэлым. Нам трэба будзе з улікам дзеючага заканадаўства сфармуляваць задачы для Савета Рэспублікі, мясцовых Саветаў дэпутатаў і прыступіць да іх выканання. У першую чаргу — за кошт пашырэння нарматыўна-прававой базы», — адзначыў спікер верхняй палаты.

Інвестыцыі падмацуюць эканоміку

Адным з прыярытэтаў краіны на бліжэйшыя гады з'яўляецца інвестыцыйная дзейнасць, і ў той жа час яна — адна з крыніц росту ВУП. У Савеце Рэспублікі ўжо было прааналізаванае заканадаўства ў гэтай сферы. Міхаіл Мясніковіч прапануе аддаць прыярытэт прамым замежным інвестыцыям, а сенатараў заклікае зрабіць усё магчымае для стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. На думку спікера, гэтаму будзе садзейнічаць і прыняцце адзінага закона аб інвестыцыйнай дзейнасці, «які ўтрымлівае нормы прамога дзеяння».

«Сёння дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы інвестыцый ажыццяўляецца больш чым 40 дзяржаўнымі органамі. 34 прававыя нарматыўныя акты рэгулююць пытанні ажыццяўлення інвестыцый, 21 з якіх — гэта заканадаўчы акт, — кажа старшыня Савета Рэспублікі. — Разнастайнасць крыніц нарматыўнага рэгулявання спараджае яшчэ адну праблему — адсутнасць прававой стабільнасці ва ўмовах гаспадарання. Для інвестараў гэта вельмі важна. Акрамя таго, сур'ёзную боязь у інвестараў выклікае сфера прымянення адказнасці. Узнікае пытанне аб несуразмернасці штрафных санкцый па інвестыцыйных дагаворах і выяўленых парушэннях».

На думку Міхаіла Мясніковіча, варта больш актыўна практыкаваць вынясенне папярэджанняў аб недапушчальнасці парушэння як першага кроку кантролю замест штрафу ці больш цяжкага пакарання. Таксама, на яго думку, развіццю сферы перашкаджае дзеянне пераважнага права аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама на куплю некаторай катэгорыі акцый і магчымасць выкарыстання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі фармальных падстаў для скасавання інвестыцыйных дагавораў нават з-за нязначных парушэнняў тэрмінаў іх рэалізацыі. Увядзенне мараторыя на правядзенне праверак у адносінах да новастворaных прадпрыемстваў, якія інвестуюць у асноўныя фонды, хоць і замацавана заканадаўча, але аказвае слабое стымулюючае ўздзеянне на развіццё інвестыцыйнай дзейнасці прадпрыемстваў не толькі малога бізнесу, але і буйных greenfield-праектаў. «Для вырашэння гэтых пытанняў спатрэбіцца ўнясенне змяненняў у законы аб інвестыцыях, аб канцэсіях, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, прыняцце новага закона аб інвестыцыйных фондах, а таксама карэкціроўка асобных палажэнняў Грамадзянскага і Падатковага кодэксаў Беларусі», — дадаў ён.

Занятасць можа быць рознай

Што тычыцца занятасці насельніцтва, то тут старшыня верхняй палаты прапанаваў легалізаваць індывідуальную працоўную дзейнасць без адкрыцця ІП. «Трэба ўводзіць патэнт для самазанятасці і вызначыць прававы статус самазанятага, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Рэгістрацыя праз куплю патэнта на самазанятасць без пастаноўкі на ўлік у якасці беспрацоўных прастымулюе прадпрымальніцкую актыўнасць асоб, якія страцілі работу, выхад з ценю тых, хто доўгі час не працуе, але ўцягнуты ў ценявую занятасць людзей».

Тэрмін «самазанятасць» і азначэнне «самазанятасці» ў нацыянальным заканадаўстве зараз адсутнічаюць. На думку спікера, да самазанятасці могуць быць аднесены асобы, якія працуюць па заяўным прынцыпе без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка: рамеснікі, супрацоўнікі сферы аграэкатурызму, работнікі асабістых падсобных гаспадарак, асобы, якія займаюцца прыбіраннем, бытавымі паслугамі. «Можна было б пашырыць віды дзейнасці, дапоўніўшы пералікі будаўніча-мантажнымі, рамонтнымі работамі, перавозкай пасажыраў і грузаў. Сёння многія з гэтых работ у цені, людзі пры гэтым не абароненыя, не могуць адстойваць свае пазіцыі ў судзе», — кажа спікер верхняй палаты і дадае, што самазанятасць можа сумяшчацца і з асноўнай працай па працоўным дагаворы.

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што сенатары і мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны імкнуцца да развіцця і падтрымкі такіх сфер, як страхавы рынак, экспарт (уніфікацыя і гарманізацыя заканадаўства з краінамі ЕАЭС), укараненне інфармацыйных тэхналогій, маладзёжная палітыка...

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Выбары-2016

ДЫЯЛОГ, ЯКІ НАТХНЯЕ

Хто такі дэпутат і што ён робіць? Як ствараюцца законы? Ці магу я асабіста паўплываць на будучыню сваёй краіны?

Такія дарослыя пытанні задавалі на працягу гадзіны дзеці, якія адпачывалі ў дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Пралеска» Жлобінскага раёна.

Адказвалі ім дарослыя, сярод якіх былі і дэпутаты, і прадстаўнікі органаў улады, і кіраўнікі грамадскіх арганізацый БРСМ і БРПА. У межах рэспубліканскага праекта «Адкрыты дыялог» была арганізавана дыскусійная пляцоўка для моладзі па абмене думкамі па актуальных пытаннях, якія абмяркоўваюць у грамадстве. Дзеці спачатку саромеліся, але калі старшыня Цэнтральнага савета піянерскай арганізацыі Вікторыя Мянанава пачала сама задаваць пытанні на тэмы, якія іх хвалююць, разняволіліся і пачалі выказваць свае меркаванні.

Між тым, як расказаў старшыня Гомельскай абласной піянерскай арганізацыі Арцём Карпенка, звычайная змена ў аздараўленчым цэнтры ператварылася ў тэматычную — пад назвай «Разумныя канікулы: салют піянеры!»

— Штодзень каля 300 школьнікаў не толькі атрымлівалі пэўныя лячэбныя працэдуры, але і вольнай часінай актыўна ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах. Для іх былі арганізаваны тэматычныя дні. Супрацоўнікі МНС, ДАІ і выратавальнікі на вадзе праводзілі спецыялізаваныя заняткі ў межах акцыі «Шчаслівае лета». Тут праведзены Дзень культуры, акцыя «Кніга.by», тэматычныя дні патрыёта і фінансавай пісьменнасці.

Яшчэ ў аздараўленчым цэнтры на працягу змены актыўна працаваў карпункт юных журналістаў. Пісаць і афармляць артыкулы дзецям дапамагалі журналісты жлобінскай газеты «Новы дзень». Урэшце атрымалася стварацьпаперовыя насценгазеты, дзе расказвалася пра змястоўнае жыццё ў аздараўленчым цэнтры. Акрамя таго, на старонцы сацыяльнай сеткі «УКантакце» штодзень з'яўляліся аператыўныя рэпартажы пра адметныя мерапрыемствы школьнікаў.

Старшыня Цэнтральнага савета піянерскай арганізацыі Вікторыя Мянанава адзначыла, што дыскусійная пляцоўка дапамагае моладзі ставіць праблемы і вырашаць іх, прапаноўваць ідэі, якія б хацелася рэалізаваць.

— Мне прыемная тая аддача, якую атрымліваю. Дыялог натхняе на новыя планы. Хочацца, каб дзеці былі нераўнадушнымі да свайго жыцця, да лёсу сваіх бацькоў, настаўнікаў і ўрэшце сваёй краіны. Калі чалавек разумее сваю ролю ў жыцці і гатовы нешта зрабіць для сваёй дзяржавы, ён будзе сапраўдным яе грамадзянінам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

❍ Тым часам

Забяспечыць парадак на выбарах гатовы

Да асноўнага дня парламенцкіх выбараў засталося два з паловай тыдні. Датэрміновае галасаванне пачнецца ўжо 5 верасня. І ад гэтага дня падраздзяленні Міністэрства ўнутраных спраў пачнуць працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Працягнецца гэта цэлы тыдзень.

— Ва ўсіх структурных падраздзяленнях Міністэрства ўнутраных спраў наладжана ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі, выканаўчымі і распарадчымі органамі, — паведаміў начальнік упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый КУР'ЯН. — Зараз нашы супрацоўнікі правяраюць тэхнічную ўмацаванасць выбарчых участкаў. А з 5 па 12 верасня будзе наладжана кругласутачная праца аператыўна-секцыйных штабоў. Выбарчая кампанія цяпер праходзіць у спакойнай абстаноўцы. Фактараў, якія могуць аказаць негатыўны ўплыў на ход яе правядзення, мы не бачым. Наша работа дазваляе забяспечыць грамадскі парадак і бяспеку, а таксама адэкватнае рэагаванне на любыя змяненні аператыўнай абстаноўкі.

Акрамя таго, актыўны маніторынг участкаў для галасавання праводзяць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Акцэнт робіцца на прафілактычнай рабоце.

— Са старшынямі выбарчых камісій і работнікамі аб'ектаў, дзе размешчаны ўчасткі для галасавання, мы праводзім адмысловыя заняткі, — расказаў першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра ўпраўлення і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Рэспублікі Беларусь Аляксандр Канавальчык. — Таксама адпрацоўваюцца схемы эвакуацыі грамадзян і тушэння пажараў. У асноўны дзень выбараў — 11 верасня — МНС таксама будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. На кожным участку будуць дзяжурыць нашы супрацоўнікі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Жніво-2016

НЕДАБОРУ НЕ БУДЗЕ

Стаўка на кукурузу

Па словах намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра Гракуна, у краіне сёлета плануецца сабраць каля 8,8 млн тон збожжа ва ўсіх катэгорыях гаспадарак з улікам кукурузы. Цяпер ужо намалочана больш за 6,7 млн тон збожжавых і зернебабовых культур. Засталося ўбраць яшчэ 131 тысячу га, з якіх 92 тысячы прыпадае на Віцебскую вобласць. Уборка зацягваецца з-за неспрыяльных умоў надвор'я.

Цяпер на складах краіны захоўваецца больш за 1 млн тон збожжа з мінулага года. Гэта павінна перакрыць той недахоп, які склаўся сёлета — прыкладна крыху больш за 0,5 млн тон. Таксама плануецца намалаціць у 5,5 раза больш кукурузы на зерне. Яе ўбяруць з плошчы ў 180 тысяч га і намалоцяць 1,2-1,25 млн тон. Гэта таксама пакрые недабор ад збожжавых. У паўднёвых раёнах краіны ўборка кукурузы на насенне ўжо пачалася. Уладзімір Гракун паведаміў, што зараз здадзена каля 90% збожжа па дзяржзаказе.

Гаворачы аб сярэдняй ураджайнасці па краіне, намеснік міністра адзначыў, што сёлета яна складае 33,7 ц/га, што менш за леташні паказчык. Але пры гэтым шэсць раёнаў краіны, сярод якіх Гродзенскі, Бераставіцкі, Шклоўскі, змаглі атрымаць ураджайнасць больш за 50 ц/га. Яшчэ ў дзесяці ўраджайнасць склала больш за 40 ц/га, а ў 52 раёнах яна перавысіла 30 ц/га.

Таксама, паводле яго слоў, сёлета плануецца сабраць больш за 500 тон кавуноў. Закранаючы тэму гародніны, намеснік міністра адзначыў, што ў апошнія гады яе вырошчваннем актыўна займаюцца не толькі сельгасарганізацыі, але і фермерскія гаспадаркі. У Беларусі цяпер 16,5 тысячы га пад агароднінамі культурамі, з іх толькі 8 тысяч га — у сельгасарганізацый. Пры гэтым ужо ёсць насенне айчыннай селекцыі, якое фермеры бяруць усё больш ахвотна. Актыўна ідзе і закладка садоў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

■ Партнёры

Не зважаючы на адлегласць

Акадэмія кіравання зацікаўлена ў супрацоўніцтве з калегамі з Паднябеснай

Дэлегацыя Кітайскай акадэміі кіруючых кадраў у сферы бізнесу з горада Далянь наведала сваіх беларускіх калег.

Па словах **Аляксандра ІВАНОЎСКАГА, першага прарэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**, перспектыўнымі кірункамі для развіцця супрацоўніцтва з'яўляюцца ўзаемныя стажыроўкі супрацоўнікаў і кіраўніцтва, удзел у міжнародных навуковых і адукацыйных праграмах і праектах, публікацыі ў навуковых выданнях, правядзенне сумесных семінараў — праз інтэрнэт.

— Хачу сказаць, што наша ўзаемадзеянне з кітайскім бокам дастаткова шчыльнае. Мы дамовіліся да таго ж абмяняцца навуковымі часопісамі, публікацыямі, — расказаў Аляксандр Іваноўскі.

Тан ЮЭ, віцэ-прэзідэнт Кітайскай акадэміі кіруючых кадраў у сферы бізнесу адзначыў, што ўдзел нашай краіны ў праекце новага Шаўковага шляху «Адзін пояс — адзін шлях» дае магчымасць рэалізаваць сумесныя з Кітаем праекты і ў сферы адукацыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ ПА ТЭЛЕФОНЕ

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 27 жніўня чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на сувязь з жыхарамі краіны выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

■ Азбука бяспекі

БЯСЦЭННЫЯ ВЕДЫ

Як паводзіць сябе ў экстрэмальнай сітуацыі, навучаць у школе

Дзяржаўтаінспекцыя заклікае бацькоў напярэдадні новага навучальнага года правесці сваіх дзяцей па бяспечным маршруце ў школу і праверыць наяўнасць у іх на сумках і вопратцы флікераў.

— Дзеці, якія зараз вяртаюцца з адпачынку ў горад, вельмі расслабленыя, ім праблематычна сканцэнтраваць увагу і кантраляваць сітуацыю,— папярэджвае **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Станіслаў САЛАВЕЙ.** — Таму трэба сваім дзецям дапамагчы — прайсці разам з імі да школы і паказаць усе небяспечныя ўчасткі з інтэнсіўным аўтатранспартным рухам.

Паводле звестак Дзяржаўтаінспекцыі, з пачатку года на дарогах краіны ў выніку ДТЗ загінула 9 дзяцей і 211 атрымала траўмы. За апошнія 10 гадоў лічба загінулых і траўмаваных у ДТЗ дзяцей знізілася прыкладна ў 4—5 разоў.

З вышыні падаюць не толькі маленькія дзеці, але і падлеткі — пераважна, з дахаў. Адна з прычын — даступнасць і адкрытасць для іх гарышчаў і тэхнічных паверхаў.

Увага! Школьнікі — на экскурсіі...

— Кантроль за наяўнасцю флікераў, увядзенне адказнасці за адсутнасць аўтакрэслаў для перавозкі дзяцей, новыя патрабаванні да школьных аўтобусаў, вяртанне ў школу «Асноў бяспекі жыццядзейнасці» — мяркуем, усе гэтыя захады разам і прынеслі свой плён, — падкрэслівае Станіслаў Салавей. — Дарэчы, дзеці трапляюць сёння ў дарожна-транспартныя здарэнні часцей па віне дарослых, а не па ўласнай віне. Значыць, тыя веды, што яны атрымліваюць у школе, калі вывучаюць правілы дарожнага руху, для іх не бескарысныя...

Восенню мінулага года ДАІ Мінска рэкамендавала сталічным школам закупіць святлоадбівальныя камізэлькі для дзяцей. Меркавалася, што насіць іх навучэнцы малодшых класаў будуць падчас арганізаваных выхадаў за межы школы. Цяпер такая рэкамендацыя дадзена ўсім беларускім школам...

— Дзеці выходзяць на экскурсіі не толькі ў светлы час сутак, але і раніцай, калі на вуліцы яшчэ цёмна. Камізэлькі пашытыя з тканіны ярка-зялёнага колеру: яны прыцягваюць увагу ўдзельнікаў дарожнага руху і днём, а таксама дысцыплінуюць дзяцей. Нездарма ў многіх краінах свету школьнікі даўно носяць святлоадбівальныя камізэлькі. Магчыма, гэта мера станоўча адаб'ецца на бяспецы дарожнага руху і ў нас, — выказаў надзею Станіслаў Салавей.

Праўда, раней было незразумела, з якіх сродкаў школы будуць закупляць падобныя камізэлькі. Дырэктары стаялі перад выбарам: купіць 10—20 камізэлек ці нейкае абсталяванне ў клас. Меркавалася, што дапамогу ў гэтым акажуць бацькі школьнікаў. Але сёлета ў рамках тэхнічнай дапамогі ад прадстаўніцтва дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) для ўстаноў адукацыі было закуплена 5250 святлоадбівальных камізэлек для малодшых школьнікаў. Яны ўжо размеркаваны па рэгіёнах у залежнасці ад патрэбаў кожнай установы адукацыі. Цяпер задача кіраўнікоў школ — прывучыць дзяцей апранаць гэтыя камізэлькі і прывіць ім культуру паводзінаў на дарозе.

Новыя рызыкі і пагрозы

Між іншым, з новага навучальнага года ў другіх і пятых класах у раскладзе вучэбных заняткаў зноў з'явіцца прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (АБЖ). На яго адводзіцца адна гадзіна ў тыдзень. Адзнакі па ім выстаўляцца не будуць. А ў 3-х, 4-х, 6-9-х класах абавязковае вывучэнне АБЖ працягнецца на факультатыўных занятках. Пераход ад факультатыву да навучальнага прадмета будзе адбывацца паступова — цягам трох гадоў. Такім чынам, змена статусу АБЖ не павялічыць нагрузку на вучняў.

Як расказала **кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ала КАЗЮЧЫЦ**, у склад міжведамаснай групы па распрацоўцы новай навучальнай праграмы ўвайшлі спецыялісты міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях, унутраных спраў, аховы здароўя, Дзяржаўтаінспекцыі і нават Камітэта дзяржаўнай бяспекі, таму што ў сучасным свеце з'явіліся новыя рызыкі, да якіх таксама трэба рыхтаваць дзяцей і падлеткаў.

У курс «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» ўвойдуць такія тэмы, як знаходжанне ў месцах адпачынку і масавага збору людзей, рызыкі паводзін, бяспека харчавання, бяспека дома, на вуліцы і пры пажарах. Дзяцей будуць вучыць навыкам абароны і самаабароны, дапамогі і ўзаемадапамогі ў сітуацыях, небяспечных для іх фізічнага, псіхічнага здароўя і жыцця. Для малодшых школьнікаў прадугледжана большая колькасць гадзін на вывучэнне правілаў дарожнага руху. У прыватнасці, уключаны пытанні бяспечнага маршруту з дома ў школу і назад, правілы паводзінаў на прыпыначных пунктах і ў транспарце.

— У Францыі, напрыклад, з улікам апошніх падзей вырашылі вучыць школьнікаў паводзінам у выпадку масавых беспарадкаў, тэрарыстычных атак і ўзяцця заложнікаў, — расказала Ала Казючыц. — Гэта на сёння вельмі актуальныя веды. Увогуле, я лічу АБЖ не вучэбным прадметам, а ўрокам, дзе даюць жыццёва неабходныя веды і навыкі, магчыма, нават больш карысныя, чым веды па той жа матэматыцы, бо яны могуць выратаваць камусьці жыццё і захаваць здароўе. Хоць сярод настаўнікаў ёсць і іншыя меркаванні — маўляў, лепш бы гэту гадзіну аддалі пад мой прадмет...

Задача педагога — выпрацаваць у дзяцей правільны алгарытм дзеянняў, як трэба паводзіць сябе ў экстрэмальнай сітуацыі: не разгубіцца і тэрмінова набраць нумар хуткай дапамогі ці выратавальнікаў, дакладна назваць прычыну выкліку і гэтак далей. І нават калі двое з 20 дзяцей успомняць, як трэба дзейнічаць, гэта ўжо неблагі вынік.

«Вывучэнне АБЖ не павінна насіць павучальны характар і тым больш — пераўтварацца ў фармальнасць, — упэўнена прадстаўнік Міністэрства адукацыі. — Дзецям трэба падаваць жыццёвыя ўрокі ў цікавай, нават гульнявой форме, з выкарыстаннем электронных і мультымедыйных сродкаў навучання. Дыскі з электроннымі сродкамі пастаўляліся ў школы МНС, МУС і Таварыствам выратавання на вадзе на бязвыплатнай аснове. Матэрыял для ўрокаў АБЖ таксама можна знайсці і бясплатна спампаваць на Нацыянальным адукацыйным партале.

Між іншым, пачынаючы са студзеня гэтага года на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі былі праведзены некалькі навучальных семінараў для настаўнікаў, якія будуць выкладаць школьнікам АБЖ, паколькі ад іх будзе залежаць вельмі многае.

Экстрэмальныя захапленні

Апошнім часам на трэцяе месца сярод прычын дзіцячай смяротнасці ад траўмаў выйшла гібель ад падзення з вышыні: за паўгода загінула ўжо 8 дзяцей. Пра гэта расказаў **намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леанід ЛОМАЦЬ**. Раней падзенне з вышыні займала ў сумным рэйтынгу толькі пятае месца. А на першых двух — па-ранейшаму дарожна-транспартныя здарэнні і ўтапленні.

«Казаць пра гэта і праводзіць нейкую прафілактыку трэба абавязкова, — лічыць спецыяліст. — Калі вы звярнулі ўвагу на апошнія плацёжкі па кватэрнай плаце, то на іх адвароце ўжо і камунальнікі пішуць пра небяспеку адкрытых вокнаў».

У курс «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» увойдуць такія тэмы, як знаходжанне ў месцах адпачынку і масавага збору людзей, рызыкі паводзін, бяспека харчавання, бяспека дома, на вуліцы і пры пажарах.

Леанід Ломаць адзначыў, што смяротнасць ад ДТЗ і ўтапленняў за апошнія гады знізілася дзякуючы добрай міжведамаснай прафілактычнай рабоце МУС, МНС, Мінадукацыі і Таварыства выратавання на вадзе. У той жа час статыстыка падзенняў практычна не змянілася: летась загінулі 16 дзяцей і за шэсць месяцаў бягучага года — 8.

Акрамя таго, з вышыні падаюць не толькі маленькія дзеці, але і падлеткі — пераважна з дахаў. Адна з прычын — даступнасць і адкрытасць для іх гарышчаў і тэхнічных паверхаў, адкуль ёсць выхад вонкі. Другая — навамодныя экстрэмальныя падлеткавыя захапленні, такія, як руфінг (лазанне па дахах) і білдзерынг (лазанне па сценах вышынных будынкаў ці будаўнічых канструкцый).

У цэлым дзіцячая смяротнасць ад траўмаў у параўнанні з 2010 годам знізілася з 20 да 8,8 выпадка на 100 тысяч. За першае паўгоддзе 2016 года загінулі 77 дзяцей, а за такі ж перыяд мінулага — 84 дзіцяці. Аднак, на думку спецыяліста, гэта ўсё роўна вельмі вялікія лічбы, а лета з'яўляецца самым траўманебяспечным для дзяцей перыядам у годзе.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Грошы

Займець свой кут

Крэдыт на будаўніцтва — пад 17% гадавых

Адпаведным рашэннем Савета Міністраў улады вырашылі падтрымаць сферу будаўніцтва жылля для тых грамадзян, якія маюць права на паляпшэнне жыллёвых умоў. Таму з трэцяй дэкады жніўня Белагрmaпрамбанк пачаў выдаваць крэдыты чаргавікам пад 17% гадавых.

Як паведамляе прэс-служба банка, крэдыты будуць выдаваць жыхарам Беларусі на будаўніцтва жылля на ўмовах долевага ўдзелу ці на будаўніцтва ў доме арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў. Крэдыт выдаецца выключна ў нацыянальнай валюце, а мінімальны аб'ём яго ў адны рукі складае 1000 рублёў (10 млн «старымі»). Спецыялісты фінансавай установы адзначаюць, што максімальная сума крэдыту — 150 тысяч рублёў, што адпавядае прыкладна 75 тысячам долараў. Разам з тым, гэтая сума не павінна перавышаць 90% ад кошту жылога памяшкання, якое крэдытуецца.

Крэдыт выдаецца фізічнай асобе на тэрмін у 20 гадоў. Стаўка па крэдыце з'яўляецца фіксаванай і складае 17% гадавых (палова стаўкі рэфінансавання плюс 8% гадавых). Забеспячэннем па крэдыце з'яўляецца паручыцельства фізічных асоб або заклад кватэры (у залежнасці ад сумы крэдыту).

Трэба адзначыць, што агучаныя ўмовы па гэтым крэдыце з'яўляюцца сапраўды прымальнымі, бо пад фінансаванне нерухомасці іншыя банкі краіны прапануюць крэдыты тэрмінам да 15 гадоў пад 25—35% гадавых.

У гэтай навіне прысутнічае толькі адзін мінус. У паведамленні Белагрaпрамбанка гаворыцца, што агульная сума сродкаў, якую банк плануе выдзеліць у якасці крэдытаў, складае 10 мільёнаў рублёў. І яшчэ. У банку ўдакладняюць, што выдача крэдытаў у межах адкрытых крэдытных ліній ажыццяўляецца ўстановай сёлета да 30 снежня.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Смачна есці!

Здароўе на талерцы

Праект па вывучэнні рынку дзіцячага харчавання, разлічаны на тры гады, стартуе ў краіне сёлета.

— Нам будзе цікава даведацца пра смакавыя прыхільнасці нашых дзяцей, зразумець, што ім падабаецца, паглядзець, як ідзе забеспячэнне дзіцячым харчаваннем у розных рэгіёнах краіны, — патлумачыў **начальнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Валерый ШЫЛАЎ.** — Спадзяёмся, што вынікі даследавання дадуць беларускім вытворцам карысную інфармацыю і дапамогуць ім павысіць колькасць якасных айчынных тавараў на ўнутраным рынку. Таксама будзе ацэнена колькасць і якасць заходніх тавараў, якія прапануюцца беларускім пакупнікам.

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Алены МАРГУНОВАЙ**, важнай задачай для навукоўцаў стала распрацоўка харчовых тавараў з прафілактычнымі якасцямі, прызначанымі для пэўных катэгорый дзяцей, у тым ліку для дзяцей з рознымі захворваннямі, для маленькіх спартсменаў і г.д. Супрацоўнікі цэнтра стварылі ўжо каля 350 розных найменняў карысных прадуктаў для харчавання дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ

■ Добрая справа

«Кніга — найлепшы сябар і падарунак»

Такую акцыю распачаў Беларусбанк да Дня ведаў

Увесь жнівень супрацоўнікі банка збіралі кнігі, якія потым перададуцца ў прытулкі, школы-інтэрнаты, бальніцы. «У нас ёсць даўняя традыцыя дапамагаць сацыяльным установам па ўсёй краіне, — расказвае **начальнік аддзела ідэалогіі ўпраўлення інфармацыі і сацыяльнага развіцця фінансавай установы Алена АСМАЛОЎСКАЯ.** — Дабрачынныя акцыі да Дня ведаў праходзяць штогод. Мы забяспечваем дзяцей-сірот канцылярскімі таварамі, адзеннем. Сёлета, у Год культуры, мы вырашылі падараваць яшчэ і кнігі. Так, літаратура, сабраная работнікамі галаўнога офіса, будзе перададзена ў хоспіс і дзіцячыя аддзяленні бальніц Мінска».

Да дабрачыннай акцыі далучылася таксама Міністэрства інфармацыі. Уласныя бібліятэчкі для дзяцей, што засталіся без бацькоў, падрыхтавалі выдавецтвы «Беларусь» і «Мастацкая літаратура». Акрамя кніг, малым перададуць таксама паштоўкі з пажаданнямі. Карткі з добрымі словамі падпісалі пісьменнікі, дэпутаты, чыноўнікі.

— Гэта важная акцыя, бо яна дасць магчымасць дзецям, якія знаходзяцца ў складаным становішчы, далучыцца да беларускага слова і літаратуры, — лічыць **намеснік міністра інфармацыі Уладзімір МАТУСЕВІЧ.** — Я асабіста перадаў у дар кнігі нашых пісьменнікаў. Вельмі спадзяюся, што малыя, якія будуць іх чытаць, атрымаюць пазітыўны зарад. Такія акцыі знакавыя і для грамадства, бо нагадваюць нам, што трэба дапамагаць іншым.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Выбары-2016: праграмы кандыдатаў

ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЯСЕНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ №100 МЕЛЯШКЕВІЧА ЮРЫЯ ВІКТАРАВІЧА

На гэтыя выбары мы ідзём з «Народнай праграмай», поўны тэкст якой можна пабачыць на сайце — prahrama.by. Гэта зборнік прапаноў па выпрацоўцы новага, пазітыўнага бачання будучыні Беларусі, распрацаваных вядомымі ў краіне экспертамі.

Мэта нашай праграмы — трансфармацыя Беларусі ў сучасную эфектыўную еўрапейскую дзяржаву, у падмурку якой знаходзяцца каштоўнасці дэмакратыі, вяршэнства права, гарантуюцца правы чалавека і прынцыпы свабоднай канкурэнтнай рынкавай эканомікі.

Прыватная ўласнасць — падмурак усіх эканамічных свабодаў

Беларусі неабходна заканадаўча замацаваная прыватная ўласнасць на зямлю. Мы прапануем: прызнаць роўныя зямельныя правы ўсіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, заканадаўча вызначыць асаблівы статус сялян як спецыфічнай катэгорыі грамадзян, звязаных з вытворчасцю і пастаўкамі сельскагаспадарчай прадукцыі, распрацаваць зямельны падатак і ўмовы іпатэкі, стварыць умовы для прыцягнення замежнага капіталу, сфарміраваць рынак зямлі.

Стварэнне новых працоўных месцаў

Мы бачым 4 крыніцы новых працоўных месцаў. Першая — індывідуальныя прадпрымальнікі, мы прапануем знізіць стаўкі адзінага падатку ў тры разы, знізіць стаўкі арэнды ў тры разы, скараціць адміністрацыйны і бюракратычны абарот. Гэта дазволіць цягам двух гадоў стварыць дадаткова каля 300 тысяч новых працоўных месцаў. Другая крыніца — малы бізнес, трэцяя — замежныя інвестыцыі, чацвёртая — дзяржаўныя прадпрыемствы, якія пройдуць рэструктурызацыю, мадэрнізацыю, частковую альбо поўную прыватызацыю.

Энергетыка і экалогія

Мы патрабуем спынення будаўніцтва Астравецкай АЭС. Патрэбная актыўная распрацоўка ўсіх альтэрнатыўных, экалагічна чыстых крыніц энергіі (сонечная, энергія ветру), што можа забяспечыць краіне 50% ад колькасці спажываемай сёння энергіі і рэзка знізіць залежнасць ад знешніх паставак. Стварэнне больш празрыстага і канкурэнтнага энергетычнага рынку павінна спрыяць зніжэнню кошту энергіі для спажыўцоў. Мы патрабуем забароны выкарыстання ў сельскагаспадарчых мэтах забруджаных чарнобыльскіх тэрыторый.

Барацьба з карупцыяй

У выніку кіравання цяперашняй улады ў Беларусі ўтварылася палітычная, эканамічная, прававая сістэма, не здольная функцыянаваць без карупцыйных схем. Па ўзроўні распаўсюджвання карупцыі Беларусь займае 123-е месца ў рэйтынгу Transparency International. Для эфэктыўнай барацьбы з карупцыяй мы прапануем вярнуць грамадзянам Беларусі магчымасць выбараў кіраўнікоў краіны і рэгіёнаў на сумленных і празрыстых выбарах, стварыць мясцовае самакіраванне, даць свабоду прэсе, аднавіць незалежнасць судовай сістэмы, усталяваць грамадскі кантроль за дзейнасцю чыноўнікаў, скараціць кіраўніцкі апарат, распрацаваць кодэкс паводзінаў службовых асоб, заахвочваць непадкупнасць і адказнасць чыноўнікаў.

Сярэдняя і вышэйшая адукацыя

Мы патрабуем ліквідаваць кантрактную сістэму ва ўсёй краіне, у тым ліку і ў школе, зменшыць нагрузку на настаўніка — не больш за пяць урокаў у дзень пры стаўцы ў 18 гадзін. Пераход на 12-гадовую школьную сістэму, развіццё сеткі прыватных школ, якія маюць частковае бюджэтнае фінансаванне, і вядома, падвышэнне заробку настаўнікам, давядзенне яго да сярэдняга па краіне. У сферы вышэйшай адукацыі мы прапануем адмяніць абавязковае размеркаванне выпускнікоў, стварыць сістэму квот, вакансій для маладых спецыялістаў.

Пенсійная рэформа

Мы прапануем: пенсійная сістэма павінна прадугледжваць стварэнне дзяржаўнага назапашвальнага страхавога пенсійнага фонду, дапаўненне працоўных пенсій недзяржаўнымі і сацыяльнымі, адмена ўраўнілаўкі, залежнасць памеру пенсіі ад працоўнага ўкладу, індэксацыя пенсій шляхам прымянення індывідуальнага каэфіцыента заробку пенсіянера, упарадкаванне пенсійных ільгот.

Каб павялічыць памер пенсій, мы прапануем адлічэнне ў пенсійны фонд не менш чым 30 працэнтаў сродкаў, атрыманых ад прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ШОСТАГА СКЛІКАННЯ ПА ПАЎДНЁВА-ЗАХОДНЯЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 98 АД ЛІБЕРАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ КАЗЛОВА ЯЎГЕНА АНАТОЛЕВІЧА

ЗА МОЦНУЮ БЕЛАРУСЬ!

Мэта маёй работы ў парламенце — умацаванне краіны. Моцная Беларусь — рэспубліка, дзе ажыццяўляецца сацыяльнае партнёрства грамадства і дзяржавы, ёсць эканамічная разнастайнасць. Моцная Беларусь — гэта інтэграцыя ў сусветную эканоміку і ператварэнне ў аднаго з лідараў Усходняй Еўропы. Моцная Беларусь — гэта краіна, якой кіруюць дзяржаўнікі: ініцыятыўныя і мабільныя кіраўнікі.

Прыярытэты маёй работы ў парламенце наступныя.

У пытаннях развіцця акругі:

Пашырыць паркавыя тэрыторыі, выканаць азеляненне і рэканструкцыю санітарна-ахоўных зон уздоўж транспартных магістраляў, пачаць будаўніцтва шумавога экрана ўздоўж МКАД і чыгункі, давесці паказчык азеляненя да сярэдняга па горадзе.

Актывізаваць развіццё сістэмы электронных дзяржаўных паслуг праз інтэрнэт.

Садзейнічаць распрацоўцы і прыняццю новых правілаў эксплуатацыі дамавых тэрыторый (двароў, парковак і інш.).

Ініцыяваць упарадкаванне рэгламенту ўтрымання і выгулу дамашніх жывёл (буйных сабак, экзатычных рэптылій і інш.).

Садзейнічаць забеспячэнню аднолькавага доступу да медыцынскай інфраструктуры і паслуг (паліклінічных стацыянараў, высокатэхналагічнай медыцынскай дыягностыкі).

Працягнуць стварэнне безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Аптымізаваць графік і чарговасць руху гарадскога грамадскага наземнага транспарту, за кошт чаго інтэрвалы падыходу транспарту скараціць у сярэднім на 1—3 хвіліны.

Распрацаваць механізм падвозу дзяцей у дашкольныя ўстановы суседніх раёнаў аўтобусам «Малышок», фарсіраваць рэканструкцыю і стварэнне дзіцячых садкоў.

Патрабаваць вынесці буйныя прамысловыя прадпрыемствы за межы горада і арганізаваць падвоз супрацоўнікаў да іх.

Размясціць 2—3 пляцоўкі для варкаўта і 1 пляцоўку для скейтынга.

У пытаннях адукацыі:

Скараціць наменклатуру спецыяльнасцяў і праграм адукацыі, паглыбіць іх практычную накіраванасць, улічваць пры фарміраванні дзяржаўнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў наяўныя магчымасці рынку працы.

Афарміць на дагаворнай аснове падрыхтоўку спецыялістаў (студэнтаў, слухачоў) за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Давесці акадэмічную мабільнасць студэнтаў і выкладчыкаў да 10% ад іх агульнай колькасці.

Увесці адзіны незалежны рэгламент атэстацыі педагагічных работнікаў.

Паставіць узровень аплаты працы педагагічных работнікаў у залежнасць ад поспехаў іх вучняў, у тым ліку з выкарыстаннем механізмаў ЦТ і незалежнай атэстацыі.

Прасоўваць экспарт адукацыйных паслуг, у тым ліку — паслядыпломнай адукацыі.

У пытаннях эканамічнага развіцця:

Садзейнічаць самазанятасці насельніцтва, у тым ліку — фермерскай, падтрымаць канкурэнцыю на рынку тавараў і паслуг.

Спрасціць механізмы перадачы памяшканняў, якія пустуюць, у карыстанне сярэдняму і малому бізнесу, змяніць прынцыпы падаткаабкладання для маладых інавацыйных прадпрыемстваў.

Акцэнтаваць увагу на рост экспарту інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій.

Стварыць адзіны рэспубліканскі каляндар падзейнага турызму, стымуляваць развіццё ўязнога турызму.

Актывізаваць персаніфікацыю пенсійных рахункаў і іншых сацыяльных выплат.

Фарміраваць механізм маладзёжных назапашвальных укладаў, у тым ліку страхавых.

У знешняй палітыцы:

Адстойваць незалежны знешнепалітычны курс.

Удасканальваць парытэт і ўзаемную выгаду адносін з краінамі свету, рэалізацыю транзітнага патэнцыялу краіны, рост эканамічнага складніка ў адносінах з далёкім замежжам.

Паскорыць дэмаркацыю дзяржаўных межаў, выступаць супраць размывання нацыянальных межаў.

Узмацніць супрацоўніцтва па праграмах ЮНЕСКА, каб пашырыць гарызонты светаўспрымання грамадзян.

■ Дзень горада

Сталіца рыхтуецца да 949-годдзя

Традыцыйна Дзень горада Мінска адзначаецца ў другія выхадныя верасня, аднак сёлета з-за парламенцкіх выбараў яго перанеслі на тыдзень раней. Якія мерапрыемствы 3-4 верасня жыхарам сталіцы варта наведаць, а ў якіх паўдзельнічаць асабіста, расказалі прадстаўнікі Мінгарвыканкама.

Дзень горада — гэта не толькі маштабнае свята, але і значная падзея ў сацыя-культурным жыцці. Напярэдадні гулянняў, 2 верасня, будуць падведзены вынікі конкурсу «Лепшы па прафесіі». А на наступны дзень у Вялікім тэатры оперы і балета пройдзе ўрачыстая цырымонія прысваення ганаровага звання «Мінчанін года», атрымліваюць якое за дасягненні ў працы і асаблівы ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё сталіцы па выніках работы за год. Прымеркавана да Дня горада і адкрыццё новых і мадэрнізаваных сацыяльных аб'ектаў. Напрыклад, у Маскоўскім раёне пасля капітальнага рамонту зноў расчыніць дзверы першы корпус Дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў №1, у Фрунзенскім пачне работу новы дзіцячы садок № 44 (вул. Нёманская, 29), а ў Савецкім пасля мадэрнізацыі зноў пачне прымаць студэнтаў 33-я гарадская паліклініка. Вялікім падарункам для моладзі стане парк экстрэмальных відаў спорту (вул. Сталетава, 1). Дарэчы, на Дзень горада недалёка ад яго пройдзе міжнародны марафон на ролікавых каньках.

Сімвалічным для Года культуры стане адкрыццё на плошчы Свабоды помніка стваральнікам першай беларускай оперы «Сялянка» — кампазітару Станіславу Манюшку і драматургу Вінцэнту Дунін-Марцінкевічу. Падчас свята ў Верхнім горадзе можна будзе пачуць музыку знакамітага кампазітара, а таксама ўбачыць фрагменты тэатральных пастановак па матывах п'ес не менш вядомага драматурга.

Святочныя мерапрыемствы будуць арганізаваны па ўсім горадзе, а асноўнай канцэртнай пляцоўкай стане тэрыторыя каля Палаца спорту. У суботу свята завершыцца музычна-піратэхнічным феерверк-шоу.

Як адзначыла першы намеснік **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віталіна РУДЗІКАВА**, у падрыхтоўцы да свята актыўна задзейнічаны ўсе гарадскія структуры.

У Дзень горада заўсёды праводзіцца мноства спартыўных мерапрыемстваў, сёлета іх будзе больш за 20. Які ён, «Жалезны пажарны», даведаюцца гледачы паказальнага выступлення супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Нікога не пакіне абыякавым і Міжнародны турнір па сілавым экстрыме. Самай маштабнай спартыўнай падзеяй — каля 20 тысяч удзельнікаў — павінен стаць другі па ліку Мінскі паўмарафон.

Каля Палаца спорту разгорнецца святочны кірмаш і Горад майстроў. Гандлёвыя аб'екты, якія зоймуць плошчу ў 5 тысяч квадратных метраў, будуць працаваць з 10 да 23 гадзін. На працягу дня будуць праводзіцца майстар-класы па прыгатаванні нацыянальных беларускіх страў. Да Дня горада ўжо ў гэтыя выхадныя, 27-28 жніўня, у дзяржаўных крамах пройдзе адзіны дзень зніжак. Хто не паспее скарыстацца выгаднай прапановай, зможа набыць неабходныя тавары падчас самога свята — зніжкі будуць дасягаць 30 працэнтаў.

Азнаёміцца з падрабязнай праграмай мерапрыемстваў можна на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта **http://minsk.gov.by/ru/**.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

Парк экстрэмальных відаў спорту, помнік у Верхнім горадзе і масавы забег

❍ Тым часам

ГАМАРДЖОБА З БЕЛАРУСКІМ АКЦЭНТАМ

У суботу ў сталіцы пройдзе фестываль грузінскай культуры

Тбілісоба — маляўнічае свята, прысвечанае заканчэнню збору ўраджаю. Штогод у канцы кастрычніка яно праводзіцца ў сталіцы Грузіі — Тбілісі — і збірае велізарную колькасць турыстаў, якія жадаюць далучыцца да масавых гулянняў. Аднак мінчане і госці беларускай сталіцы ўжо другі раз змогуць наведаць свята, не выязджаючы ў цёплую Грузію.

За гэта лета фестывалі нацыянальных культур сталі сапраўднай «фішкай» Верхняга горада. Мінчане паспелі пагрузіцца ў польскую, карэйскую, украінскую культуру і вось цяпер на чарзе — грузінская, зноў. Менавіта падчас леташняй Тбілісобы зарадзілася ідэя аб прадастаўленні пляцоўкі ў Верхнім горадзе дыяспарам, якія гатовы расказаць пра свае нацыянальныя асаблівасці.

Пасол Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь Давід КАТАРЫЯ адзначыў, што паміж дзвюма дзяржавамі заўсёды былі цёплыя, сяброўскія адносіны. Аб іх умацаванні сведчыць штогадовае павелічэнне тавараабароту і турыстычнага патоку.

Як вядома, грузіны вызначаюцца сваёй гасціннасцю, таму і само свята пабудавана вакол гэтага: гасцей чакае вясёлае застолле. Нездарма другая назва фестывалю — гастранамічны: два дзясяткі рэстаранаў грузінскай і беларускай кухні прапануюць наведвальнікам свята традыцыйныя прысмакі. А размясціцца з імі госці змогуць за стометровым агульным сталом. Не абыдзецца свята і без гарачых грузінскіх танцаў і душэўных песень.

Сямейная газета

Выпуск № 16 (59)

Няма праблемы, калі ёсць Бог

У панядзелак ранкам прачнулася з панічнымі думкамі: «Колькі ж мне ўсяго трэба зрабіць! Як жа я ўсё паспею?» Два тэрміновыя артыкулы, што планавала дапісаць на выхадных, нават не адкрыла. Любімае варэнне з брусніц, што назбірала, так і не зварыла... Бо вярнулася на здымную кватэру позна, і аказалася, што ў мяне няма вялікага таза, каб змясціць за адзін раз туды ўсе ягады.

І вось еду на працу з роем праблем (іх насамрэч было больш, чым я пералічыла) у галаве. Якраз у гэты момант тэлефануе маці, яна таксама ў паніцы (і яе можна зразумець, за апошнія два месяцы ў бацькоў зламаліся пыласос, халадзільнік, мабільнік, парнік...): «Гэта ты тэлевізар сапсавала? (Я ездзіла на выхадныя дадому.) Ён не паказвае...» — «Ну, вядома, не. Ты ж ведаеш, што я ўжо больш як 10 гадоў не гляджу тэлевізар...»

Толькі паспела пакласці трубку, як раздаўся званок ад расхваляванай маці мужа: «Што гэта Вова трубку не бярэ? Можа, з ім што здарылася?»

Як вы здагадаліся, ніводнага артыкула я ў той дзень не дапісала. Мне не давалі засяродзіцца хваляванні абедзвюх матуль і нязваранае бруснічнае варэнне. Разумела, што марную энергію ўпустую, але нічога не магла з сабой зрабіць.

Увечары муж, убачыўшы, што я вярнулася дадому сама не свая, запытаўся, што здарылася. І замест таго, каб супераживаць, узяў у рукі кубак з вадой, выцягнуў яго наперад і спытаў:

— Як ты думаеш, колькі важыць гэты кубак?

— Трыста грам! — адмахнулася я.

— А што адбудзецца, калі я буду так трымаць яго на працягу некалькіх хвілін?

— Нічога!

— А калі гадзіны дзве?

— Ты стомішся.

— А калі цэлы дзень?

— Ты вельмі моцна стомішся. А рука анямее і яе паралізуе, калі ты не апусціш яе.

— Як, па-твойму, вага кубка зменіцца ад таго, што я яго цэлы дзень буду проста трымаць?

— Не!

— А што трэба рабіць, каб усё гэта выправіць?

— Проста пастаў кубак на стол!

— Сапраўды! — радасна адказаў муж. — Так і з усімі жыццёвымі цяжкасцямі. Варта падумаць пра якую-небудзь праблему некалькі хвілін, і яна апынецца побач. Калі думаць пра яе некалькі гадзін, яна пачне засмоктваць. Калі думаць пра яе цэлы дзень, яна нас паралізуе. Можна думаць аб праблеме, але, як правіла, гэта ні да чаго не прыводзіць. Яе «вага» не паменшыцца. Справіцца з праблемай дазваляе толькі дзеянне. Трэба вырашыць яе або адкласці ўбок.

...У той вечар я зварыла бруснічна-грушавае варэнне — столькі, колькі змясцілася ў трохлітровую каструлю. Астатнія брусніцы, па парадзе сяброўкі, проста перацерла з цукрам, карыцай і імбіром. Чым вельмі парадавала мужа, які адразу быў супраць таго, каб я знішчала жывыя вітаміны на агні. Толькі паспела раскласці смакоцце ў слоікі, як патэлефанавала радасная мама: аказваецца, тэлевізар не зламаўся, а проста быў у спячым рэжыме, у які яго выпадкова, націснуўшы не тую кнопку, паставіў тата. Што тычыцца Вовы, то, як вы ўжо зразумелі, ён жывы і здаровы. А не адказваў на званкі, бо проста забыўся дома тэлефон. Артыкулы (у тым ліку і гэтую калонку) я таксама дапісала — на наступны дзень, прычым вельмі хутка.

...Сёння зноў прачнулася з роем мітуслівых думак у галаве. Хацела па звычцы пайсці ў іх на повадзе, але прыгадала кубак з вадой у выцягнутай руцэ і Амара Хаяма, які раіў: «Не кажы Богу, што ў цябе ёсць праблема. Павярніся да праблемы і скажы, што ў цябе ёсць Бог».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

dryla@zviazda.by

■ Тыя, хто побач

«Я не баюся выглядаць смешнай»

Карэспандэнты «Звязды» завіталі ў госці да сяміразовай бабулі, больш вядомай як клаўнеса Люся

Фота Надзеі БУКАН.

Дзверы нам адчынілі шэсць унукаў Галіны СУШЫЦКАЙ, побач з імі радасна віляла хвосцікам такса Рычы. «Знаёмцеся: гэта — Кузьма, Леў, Станіслаў, Антоній, Анастасія, Ангеліна, — выглядвае з пакоя бабуля-клаўнеса. — Старэйшага ўнука — Кацпера — у ваенкамат выклікалі, ён у нас ужо дарослы, вучыцца ва ўніверсітэце». Убачыўшы фотаапарат, брацікі і сястрычкі імгненна сталі ў радок ля шафы. «Дзеці, зрабіце сумныя твары. А цяпер вясёлыя, закаханыя...» Адно задавальненне назіраць, як артыстычна малыя выконваюць бабуліны каманды.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

■ Праект «з разыначкай»

ЧАРОЎНЫ СВЕТ ВАРВАРЫ

Мама напісала кнігу па казках сваёй трохгадовай дачкі

Дзядуля Эспэн і цётачка Разарыя, пчолка Пенябіпка і вусень Бабу Ба Біба. Усе яны — жыхары чароўнага ружовага лесу, прыдуманага трохгадовай Варай. Праз іх маленькая дзяўчынка расказвала пра свае страхі, перажыванні, надзеі і адкрыцці. Яе мама, Алена Тагіль, уважліва слухала, а аднойчы пачала запісваць...

— У душы я даўно паэтка і казачніца, — расказвае Алена. — У школе мела шмат грамат і першыя месцы на літаратурных конкурсах. Але ў сёмым класе мяне неяк моцна засаромілі, і, як гэта бывае ў дзяцей, пісаць я перастала. Неяк натрапіла на маркетынг і стала ў ім добра разбірацца. Я строіла стратэгіі памерам з нью-ёркскія хмарачосы. Але аднойчы да мяне прыляцела цудоўная дзяўчынка — мая дачка Варвара, і ўсе дамы адразу сталі маленькімі, а стратэгіі не такімі важнымі. Дзелавыя касцюмы разам з туфлямі на абцасах добраахвотна адправіліся з шафы ў скрынку з пометкай «Даўно мінула». Паэтка і казачніца прачнуліся зноў. І цяпер я ледзь паспяваю запісваць усе тыя цуды, што з намі адбываюцца.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)



Калі аднойчы Вара захоча стаць пісьменніцай, мама падтрымае яе выбар.

■ Асабістая гісторыя

«РАЮ ЎСІМ ЖАНЧЫНАМ ПЕРАСТАЦЬ БАЯЦЦА І ЗАГАВАРЫЦЬ»

«З мужам пражыла ў шлюбе амаль 20 гадоў, — з дрыготкай у голасе ўспамінае Настасся (імя зменена), якая разам з 12-гадовым сынам хавалася ў прытулку для пацярпелых ад хатняга гвалту каля 2 месяцаў. — Калі пачалі жыць разам, адразу з'явіліся вар'яцкія праявы. Проста, калі чалавека кахаеш, на многае заплюшчваеш вочы. Ён стаў прыходзіць дадому нецвярозым. Калі выпіваў, то рабіўся неадэкватным: замыкаў кватэру, забіраў ключы і тэлефоны. Ужо з першых гадоў шлюбу ён стаў мяне біць. Спачатку ўсё абыходзілася сінякамі, потым пайшлі сур'ёзныя пераломы. Ён пускаў мяне толькі на працу і на дзесяць хвілін у краму, заўсёды дасканала правяраў чэкі, кантраляваў мой заробак да апошняй капейкі, некалькі разоў замахваўся на сыночка. Гэта цягнулася гадамі...

Я жывіла сябе ілюзіямі, што муж зменіцца, жыла па прынцыпе «Б'е — значыць кахае». Калі з'явілася дзіця, я пачала задумвацца, з каго яно будзе браць прыклад. Памятаю, як малы вельмі спужаўся, калі я не магла спыніць кроў. Раней сын заікаўся, потым я яго вылечыла. Мне не было куды ўцячы: родных няма, сяброўак таксама за ўсе гады не засталося. Наогул мне было сорамна камусьці расказаць пра свае праблемы, бо людзі, якія не траплялі ў падобную сітуацыю, мяне проста не разумелі.

Шмат разоў звярталася ў міліцыю. Каб прынялі заяву, я павінна была «зняць пабоі», аднак муж не выпускаў мяне з кватэры. Некалькі разоў яго забіралі, адзін раз ён збягаў да прыезду міліцыі. Тады я набралася сіл і пайшла ў сацдапамогу па месцы жыхарства, там мне і падказалі нумар «гарачай лініі». Апошні раз, калі муж напіўся і пачаў буяніць, я паспела яго набраць, дзяўчына на тым канцы праводу выклікала міліцыю. У той вечар я апынулася ў прытулку».

Прытулак на базе МГА «Гендарныя перспектывы» адкрыўся ў чэрвені 2014 года ў рамках сумеснага праекта з Аўстрыяй. Ён месціцца ў прасторнай двухпакаёвай кватэры ў адным са спальных раёнаў Мінска. З мэтай бяспекі яе адрас не распаўсюджваецца, а сустрэчы са спецыялістамі з розных арганізацый праходзяць на нейтральнай тэрыторыі. Кватэра разлічана на дзве сям'і. Тэрмін пражывання можа расцягнуцца больш чым на тры месяцы.

Іна САЛЕНІКОВІЧ, псіхолаг МГА «Гендарныя перспектывы»: *«У нашых жанчын вельмі шмат страхаў: страшна пайсці да псіхатэрапеўта, страшна быць адной, страшна застацца без фінансавай дапамогі. Акрамя гэтага, псіхалогія агрэсара ў тым, што ён заўсёды вінаваціць ахвяру. Кліенткі пачынаюць капацца ў сабе і ва ўсім сябе вінаваціць. У працы з пацярпелымі ад хатняга гвалту ўвага звяртаецца на падняцце самаацэнкі, усведамленне ўласнай каштоўнасці і веру ў свае сілы. Змяніць агрэсара немагчыма. Можна змяніць сітуацыю пры доўгай і глыбокай працы над адносінамі абаіх партнёраў. Абое павінны пайсці да спецыяліста: агрэсар — каб навучыцца пераадольваць гнеў, ахвяра — каб пазбавіцца ад сузалежнасці. Потым пажадана прайсці сямейную тэрапію».*

Настасся з сынам апынулася ў «крызісным пакоі» ў ліпені мінулага года. У яе не было сродкаў для існавання і нагадвалі пра сябе праблемы са здароўем. Акрамя гэтага, муж спрабаваў знайсці «прапажу» і вярнуць у «зняволенне». «У прытулку мяне забяспечылі прадуктамі харчавання, аплацілі дарогу і лекі, дапамаглі зафіксаваць пабоі і аформіць заяву, падключылі юрыстаў і адвакатаў, аказалі псіхалагічную і медыцынскую дапамогу», — кажа Настасся.

«Ён пускаў мяне толькі на працу і на дзесяць хвілін у краму, заўсёды дасканала правяраў чэкі, кантраляваў мой заробак да апошняй капейкі, некалькі разоў замахваўся на сыночка. Гэта цягнулася гадамі...»

За два гады паслугамі прытулку скарысталіся 39 жанчын і 45 дзяцей. «На жаль, праект, у рамках якога «сховішча» было адкрыта, завяршаецца, — дзеліцца **кіраўніца прытулку для пацярпелых ад хатняга гвалту МГА «Гендарныя перспектывы» Наталля БУБЛЕЙ.** — Цяпер шукаем новую крыніцу, якая здолее фінансаваць прытулак. Арэнда памяшкання, камунальныя паслугі, аплата прадуктаў і консультацыі спецыялістаў — усё гэта вялікія грошы, якія не надта проста знайсці».

Сёння ў Беларусі каля 110 «крызісных пакояў». Дзейнічаюць яны пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Як альтэрнатыва дзяржаўным маюцца прытулкі няўрадавых арганізацый (тры — у Мінску, па адным — у Лідзе і Магілёве).

У Настассі жыццё паступова ідзе на лад. Жанчына працуе і самастойна здымае жыллё, яна стала ўпэўненай у сабе. «Я цяпер адчуваю сябе значна лепей, — прызнаецца Насця. — Муж працягвае за мной хадзіць, аднак не падыходзіць блізка: зараз ідзе судовы працэс. Я раю ўсім жанчынам, якія пакутуюць ад падобных праблем, перастаць баяцца і загаварыць. Калі б не звярнулася па дапамогу, я не ведаю, чым бы гэта скончылася для мяне і майго дзіцяці».

Агульнанацыянальная «гарачая лінія» для пацярпелых ад хатняга гвалту: 8 801 100-88-01 (штодзённа з 08.00 да 20.00).

Вераніка УЛАСЕВІЧ. *veronika.ulasevich@mail.ru*

■ Выйсце ёсць

«АДКАЗНАСЦЬ ЗАЎСЁДЫ НА ТЫМ, ХТО Б'Е»

Псіхолагам трэба працаваць не толькі з ахвярамі

«Нашы кліенты — і рознарабочыя, і міліцыянеры, і дыпламаты, і артысты». З 2014 года ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей праводзяць кансультацыі для мужчын, якія прымяняюць гвалт. За гэты час па псіхалагічную дапамогу звярнулася больш за 60 агрэсараў. У маштабах краіны (дый нават сталіцы) лічба зусім невялікая: па статыстыцы кожная трэцяя беларуска падвяргалася хатняму гвалту. Але, магчыма, у гэтых больш чым паўсотні сем'ях жыццё нарэшце зменіцца да лепшага.

Чаму агрэсары самі вырашаюць прыйсці да псіхолага? Наколькі эфектыўная карэкцыйная праграма? І ці ёсць гарантыя, што мужчына пасля праходжання тэрапіі больш ніколі не падыме руку на жонку?

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

На тэрапію прыходзяць па сваім жаданні

У аснове карэкцыйнай праграмы для мужчын-агрэсараў — Дулуцкая мадэль, якая ўжо больш за 30 гадоў паспяхова працуе па ўсім свеце. Яе прымяняюць у ЗША, Вялікабрытаніі, скандынаўскіх краінах, Польшчы, Украіне.

— Асноўная ідэя — гэта тое, што гвалт — засвоеныя паводзіны, — тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацабслугоўвання сям'і і дзяцей Раман КРУЧКОЎ,** які займаўся адаптацыяй амерыканскай мадэлі для прымянення ў Беларусі. — Мужчына так ці інакш усведамляе, што ён робіць, а значыць, мусіць прыняць на сябе адказнасць. Заўсёды адказнасць на тым, хто б'е, таму што ў любы момант ён мае магчымасць стрымацца.

Праграма цягнецца ад 6 да 8 месяцаў. Агрэсары штотыднёва бясплатна наведваюць індывідуальныя тэрапеўтычныя сеансы, ходзяць на групы. Як правіла, праз паўтара-два месяцы мужчыны адмаўляюцца ад фізічнага гвалту. Астатні час ідзе «шліфоўка»: чалавеку дапамагаюць разабрацца, што яму трэба змяніць у сабе, як наладзіць адносіны з партнёркай. Псіхолагі вучаць мужчын новым спосабам камунікацыі, паказваюць, як скідваць эмацыйнае напружанне, тлумачаць наступствы гвалту для ўсёй сям'і.

Складана ўявіць, каб агрэсары па сваім жаданні ішлі на тэрапію, але... Раман Кручкоў кажа, што мужчыны звяртаюцца тады, калі гвалт становіцца праблемай і для іх. Аказваюцца пад судом за абразу ці катаванне, жанчына сыходзіць, дзіця пачынае капіраваць іх паводзіны.

Часта схадзіць да псіхолага агрэсараў просяць жонкі. Ці самі звяртаюцца ў цэнтр абсалютна па іншай праблеме, а ў працэсе высвятляецца, што ў іх сям'і ёсць хатні гвалт.

— Для некаторых ахвяр гэта з'яўляецца адкрыццём, — заўважае спецыяліст. — Яны жывуць, цвёрда разумеючы, што такія паводзіны — норма, таму што, напрыклад, у іх уласных сем'ях было тое ж самае. А чалавек можа сістэматычна прыніжаць жанчыну, сарамаціць, маніпуляваць, кантраляваць — гэта таксама формы гвалту.

Агрэсар сам ахвяра гвалту

Чаму мужчыны прыбягаюць да гвалту? Матывацыя простая: я прымяняю сілу, калі хачу, каб ты перастала рабіць тое, што робіш, ці зрабіла тое, чаго не хочаш. А іншымі сродкамі не атрымліваецца. Часцей за ўсё агрэсары прызнаюцца, што перад уласна актам гвалту яны адчувалі бяссілле. І злосць, што не ўдаецца ніяк настаяць на сваім.

Фізічны гвалт выкарыстоўваюць часам для эмацыйнай разгрузкі.

— Калі, працуючы з такім чалавекам, капаць углыб, у большасці выпадкаў удаецца ўстанавіць, што ён сам — ахвяра гвалту, — прызнаецца Раман Кручкоў. — Напрыклад, у дзяцінстве яго абражалі, высмейвалі. Неабавязкова тата агрэсар. Мамы часта прыніжаюць: «На каго ты падобны!», «Свіння такая!». Усё гэта падрывае самаацэнку маленькага чалавека. Плюс да ўсяго дзеці, як губка, убіраюць стыль зносін паміж бацькамі. Калі ёсць дысфункцыянальная камунікацыя, малыя гэта счытваюць і потым паўтараюць, у гульнях напрыклад. Гвалтоўным паводзінам усё ж такі вучацца.

Мужчыны звяртаюцца тады, калі гвалт становіцца праблемай і для іх. Аказваюцца пад судом за абразу ці катаванне, жанчына сыходзіць, дзіця пачынае капіраваць іх паводзіны.

Калі мужчына ўжо аднойчы прымяніў сілу, пытанне не стаіць так: ці зробіць ён гэта яшчэ раз? Ён у прынцыпе здольны на гвалт і гэта паказаў. Многія пры гэтым адмаўляюць праблему.

— Вы пераходзілі дарогу на чырвоны? Не ідзяце ж адразу самі плаціць штраф? Вось і там тое ж самае. На глыбінным узроўні яны не лічаць, што робяць нешта няправільнае. Так, яна дурніца, крычала, і я ёй паказаў, хто ў доме гаспадар.

Тэрапія патрэбна не толькі агрэсарам. Іх жонкам, якія чамусьці застаюцца ў гэтых адносінах, таксама неабходна працаваць над сабой. З імі псіхолагі займаюцца асобна.

— Калі мужчына пачынае наведваць праграму, многія лічаць, што справа зроблена. Ён перастае біць, жанчына расслабляецца... і ўсё вяртаецца. Змены патрабуюць намаганняў і часу. І мяняцца павінны абое. Я не кажу, што жанчына нясе частку адказнасці за тое, што яе б'юць. Не. Але калі яна не зразумее, у якіх умовах жыве і як ёй трэба рабіць, каб не быць ахвярай гвалту, то не думаю, што яе становішча надта палепшыцца, — каментуе псіхолаг.

Абавязалаўка павінна быць

Уласную статыстыку эфектыўнасці праграмы ў цэнтры пакуль не вядуць: выбарка не вельмі вялікая. Але замежны вопыт сведчыць: каля 75 працэнтаў мужчын пасля праходжання карэкцыі перастаюць прымяняць гвалт.

— А што з астатнімі 25-ццю?

— У нас няма мэты вылечыць усіх, хутчэй — даць магчымасць змяніцца. Мы не лічым гэта няўдачай. У нас дакладнае разуменне межаў. Мы робім тое, што неабходна тут, адказваем за гэта, а мужчына — за тое, што адбываецца дома. Калі, узброены ведамі, ён усё ж такі прымяняе гвалт, то гэта яго рашэнне, — кажа псіхолаг.

Раман Кручкоў быў на стажыроўцы ў Штатах па гэтай тэме, вывучаў, як працуе карэкцыйная праграма ў іх. У ЗША 30-40 працэнтаў агрэсараў прыходзяць на тэрапію па рашэнні суда, яшчэ 30 працэнтаў — тыя, хто не стаў чакаць, пакуль трапіць пад следства (яны звяртаюцца па рэкамендацыі сацыяльных службаў). Для амерыканцаў, дарэчы, праграма платная: адно наведванне каштуе каля 30-40 долараў.

Беларускіх мужчын прымусіць запісацца на тэрапію не могуць. У нас пакуль адсутнічае закон аб хатнім гвалце, які б, з аднаго боку, стаў моцнай матывацыяй для агрэсараў пайсці да псіхолага (бо дакладна прапісваў бы, што адносіцца да гвалту і якое за гэта пакаранне), з другога — дзейсным рычагом ціску.

— Гвалт сам па сабе не заканчваецца, яго трэба спыняць. За мяжой суддзя можа прымусова накіраваць чалавека на тэрапію. У нас я ездзіў па судах, расказваў аб праграме, прапаноўваў рэкамендаваць яе мужчынам. Думаеце, хоць з аднаго прыйшоў агрэсар? Суддзі спасылаюцца на тое, што няма адпаведнага дакумента... Ведаеце, хто накіроўвае? Загадчыца дзіцячага садка. Таму што ёсць 18-ы дэкрэт, па якім могуць адабраць дзяцей, і гэтага баяцца.

Раман Кручкоў упэўнены: нейкая абавязалаўка ўсё ж такі павінна быць. Бо зойдуцца тыя, хто да апошняга будзе ўпірацца, што гвалт у сям'і — не праблема. А праца толькі з ахвярамі не дапаможа цалкам выправіць сітуацыю. «Мужчына-агрэсар, выхавае сына з такімі ж установкамі, а пасля гэты хлопчык вырасце і трапіць вашай дачцэ. Усё ўзаемазвязана».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Выбар сэрцаў

«Ірына лечыць целы, а я — душы»

Чым жыве сям'я адзінага ў Беларусі лютэранскага пастара

«Журналісты тэлефанавалі, пыталіся, чаму не запрасіў іх на вянчанне. А я не думаў, што людзям гэта будзе цікава». Мінулай восенню галоўнай навіной гродзенскай свецкай хронікі стала вяселле лютэранскага пастара Уладзіміра ТАТАРНІКАВА. Фотаздымкі святара і яго прыгожай нявесты Ірыны трапілі тады ледзь не ва ўсе мясцовыя СМІ. Яшчэ б: гэта было першае вянчанне за ўсю гісторыю кірхі.
З Уладзімірам і Ірынай мы сустракаемся ў іх дома. У джынсах, пад гарбату і жарты, у адным з нямногіх пакояў, дзе цяпер не ідзе рамонт, размаўляем пра асабістае і спрабуем растлумачыць, якая яна — сучасная пастарская сям'я.



Выбар з дзяцінства

Пастарам Уладзімір Татарнікаў прызначаны з 2009 года. Свой прыход у святарства ён успамінае так:

— Я з міліцэйскай сям'і. Бацькі працавалі ў органах, брат таксама. А я ўвесь час з маленства хацеў служыць у царкве. Я ўвогуле быў актыўным дзіцем. Усе гурткі наведваў, якія толькі магчыма. І мяккай цацкі, і фларыстыкі, а яшчэ танцы, каратэ, лёгкая атлетыка. На тэлебачанні быў, спрабаваў сябе ў якасці вядучага. Але чамусьці цягнула менавіта ў святары.

Бацька першапачаткова быў супраць таго, каб я паступаў у семінарыю вучыцца. Спадзяваўся, што таксама па яго шляху пайду. Але я лічыў, што ў нашай сям'і дастаткова міліцыянераў. Трэба таксама паслужыць, але крыху ў іншай сферы. Як кажуць лютэране, чалавек павінен працаваць па прызванні. І не трэба саромецца гэтага.

«Цешча дзеля мяне асвоіла інтэрнэт»

— У нас звычайна так: Вова расказвае, а я слухаю і ківаю, — з усмешкай папярэджвае Ірына.

— Яна ж доктар (тэрапеўт у паліклініцы. — **Аўт.**). Прывыкла слухаць. А ў мяне іншая сфера, — апраўдваецца Уладзімір. — У нас тандэм: Ірына лечыць целы, а я душы.

— Раскажыце, як пазнаёміліся.

Уладзімір: — Гэта было ў сяброў на вяселлі.

Ірына: — Мая сяброўка, якая выходзіла замуж, раней мімаходзь расказвала, што ёсць у іх прыяцель такі, служыць пастарам у Гродне. Я тады нават не звярнула ўвагі. Потым перасекліся на вяселлі — і пачалося.

— І чым зачапілі адно аднаго?

Уладзімір: — Ну тут ясна. Я — прыгажосцю *(смяецца)*. А Ірына чым спадабалася — навуцы невядома.

Ірына: — Зразумеў, напэўна, што яго чалавек. Спачатку перапісваліся, як гэта цяпер у моладзі, праз сацыяльныя сеткі. Вова мяне знайшоў. Потым ужо на спатканні хадзіць сталі. Я тады вучылася ў Гродне ў медыцынскім універсітэце, на шостым курсе.

— Пра лютэранства што-небудзь ведалі (Ірына з праваслаўнай сям'і. — Аўт.)?

Уладзімір: — Было праблемай расказаць ім, што Ірына сустракаецца са святаром. Таму што сёння, на жаль, у паняцці многіх людзей святар — гэта чалавек ва ўзросце, з доўгай барадой, далёкі ад сучаснасці. Бацькі думалі: як гэта так, дачка атрымала вышэйшую адукацыю, а стане матушкай. Будзе сядзець у царкве, прадаваць свечкі. А калі Ірына сказала, што я да таго ж і лютэранскі пастар, бацькі былі ў яшчэ большым шоку. Цешча нават, для таго каб больш даведацца пра лютэранства і кім з'яўляецца зяць, асвоіла інтэрнэт.

Ірына: — Увогуле нічога.

Уладзімір: — А цяпер яна эксперт у гэтым, можа вам па палічках усё раскласці *(усміхаецца)*. У нас пра лютэран мала ведаюць. Некаторыя мае знаёмыя думаюць, што гэта нейкая секта. Пачынаеш ім тлумачыць: лютэранская абшчына афіцыйна зарэгістравана. Не аргумент. І толькі калі кажаш, што нас паказваюць па дзяржаўным тэлебачанні, тады згаджаюцца: ну так, пра секту не сталі б расказваць.

— Як навіну пра зяця-пастара ўспрынялі Ірыніны бацькі?

Вянчанне, як у амерыканскіх фільмах

— Чытала, што ваша вяселле было даволі традыцыйным: выкуп, загс, рэстаран...

Уладзімір: — Калі прыйшоў тамада, каб абмеркаваць арганізацыйныя пытанні, ён адразу спытаў: «Я пачытаў пра лютэранства, але нідзе не напісана, як у вас праходзіць вяселле». Мы яму кажам: няма пэўных правілаў. Адзіная галоўная традыцыя — вянчанне. Сказаць «так» адзін аднаму, «і ў радасці і ў горы, пакуль смерць не разлучыць». У нашай царкве вянчанне носіць характар малітвы, мы просім Божага бласлаўлення для сям'і.

Гасцям з Ірынага боку хапіла, што цырымонія праходзіла ў кірсе. Гэта ўражанне надоўга.

Ірына: — Усім вельмі спадабалася. Казалі: як у амерыканскіх фільмах. Тата пад руку вядзе нявесту да алтара, перадае мужу, гучыць арган... Многія арган чулі ўпершыню.

— Жонцы лютэраніна трэба пераходзіць у канфесію мужа?

Уладзімір: — Гэта неабавязковая ўмова. Нават калі муж святар. Таму што нельга сілком перацягваць з адной канфесіі ў іншую. Чалавек павінен сам да гэтага прыйсці. Цяпер жа многія сем'і праз спрэчкі аб рэлігіі распадаюцца. Асабліва калі справа даходзіць да хрышчэння дзіцяці.

— А ў вашай сям'і спрэчак наконт гэтага не ўзнікне?

Уладзімір: — У нашай царкве дзіця хрысцяць яшчэ малым, але мы не кажам, што ён ужо лютэранін. Чалавек становіцца хрысціянінам, рукі Бога яго аберагаюць. А потым, калі яму споўніцца 16 гадоў, ён праходзіць абрад канфірмацыі: пацвярджае сваё хрышчэнне і выбірае тую канфесію, у якой сябе бачыць. Мы не лічым, што гэта няправільна, калі чалавек пераходзіць у праваслаўе ці каталіцтва. Ён жа застаецца ў хрысціянскай царкве, толькі ў іншай канфесіі.

— Дарэчы, колькі разоў пастар можа ажаніцца?

Уладзімір: — Нейкага правіла наконт гэтага няма. Пытанне ў іншым: які прыклад ты паказваеш тым, хто цябе слухае? Наша царква, як і ўсе, не ўхваляе разводаў.

Сям'я пастара заўсёды на віду

— Замужжа за пастарам накладвае нейкія абавязкі, забароны?

Ірына: — Я забарон пакуль не заўважала. Хаджу ў тым адзенні, у якім зручна. Так, трэба захоўваць прыстойны выгляд, але нічога звыш.

Уладзімір: — Жонка пастара павінна падтрымліваць хатні ачаг і сустракаць гасцей. Праблема ў тым, што ў доме, дзе мы жывём, праходзяць і мерапрыемствы абшчыны. Тут пастаянна ёсць людзі. І псіхалагічна гэта не кожны можа вытрымаць. Для сустрэч з прыхаджанамі ў нас ёсць асобны пакой, але ўсім жа хочацца павітацца з Ірай, спытаць, як справы, паклікаць гарбаты папіць. Не заўсёды атрымліваецца мець асабістую прастору.

Да таго ж пастар на мерапрыемствах, якія праходзяць у жыцці абшчыны, заўсёды павінен быць з жонкай.

— На нядзельных службах Ірына таксама мусіць быць з вамі ў кірсе?

Уладзімір: — Па магчымасці. Але ўсе мы грэшныя, і лянота часам перамагае слова мужа *(смяецца)*. Я калі вяду службу, падчас пропаведзі на яе прыкладзе кажу: вось што з людзьмі лянота робіць.

— Ірына, не раўнуеце мужа да прыхаджан?

Ірына: — Не.

Уладзімір: — Яна ведала, куды ідзе. Была папярэджаная.

Ірына: — Я таксама разумела, што акрамя ўвагі да мужа, будуць праяўляць цікавасць і да мяне. Журналісты будуць задаваць пытанні *(усміхаецца)*.

Уладзімір: — Быць жонкай пастара адна праблема — ты заўсёды на вачах. Як Ірына кажа, немагчыма са мной па горадзе ісці. Паехалі неяк у Віцебск да маіх бацькоў, а там мяне ніхто не ведае. Ірына здзівілася: глядзі, мы прайшлі колькі, і цябе ніхто не спыніў. А ў Гродне часта падыходзяць спытаць нешта, пагутарыць.

«Святы адзначаем двойчы»

— Жонка святара заўсёды ўяўляецца хатняй гаспадыняй...

Ірына: — Лічу так: чаму я павінна прыходзіць з адной працы і выконваць іншую? Мы па гаспадарцы ўсё разам робім. Прыбіраемся, гатуем.

— Хто ў сям'і пастара кармілец?

Уладзімір: — Хто прынясе заробак, той і нясе матэрыяльную адказнасць *(смяецца)*. У нас няма дакладнага падзелу абавязкаў.

— Што наконт свят у вашай сям'і?

Ірына: — Два разы адзначаем: па праваслаўным і лютэранскім календары.

Уладзімір: — На лютэранскія Каляды абавязкова робім глінтвейн для прыхаджан. Звычайна набывалі, а сёлета я вырашыў прыгатаваць сам. У нас ёсць вячэрняя служба, дзе мы збіраемся ўсе разам, спяваем святочныя харалы. Прыхаджане пякуць булачкі. Каляды — маё любімае свята. Асабліва калі снег ёсць.

— Як праводзіце вольны час? Ці часта ўдаецца кудысьці выбрацца?

Уладзімір: — Вось як пажаніліся, амаль не было гэтай магчымасці.

Ірына: — Я праходзіла інтэрнатуру ў Брэсцкай вобласці і паўгода пасля вяселля ездзіла амаль за 200 кіламетраў у Гродна на выхадныя. З мая ўжо жыву тут. Калі застаёмся ў горадзе, то да сяброў ходзім, у кавярні, проста па Гродне шпацыруем. Часта ездзім да маіх бацькоў дапамагаць па гаспадарцы.

Уладзімір: — Хутка вось бульбу капаць паедзем, 25 сотак агарода як-ніяк. Сям'я святара — такія ж людзі, як і ўсе.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Фота з архіва герояў.
г. Гродна

■ Пра галоўнае

ЯК ЗАХАВАЦЬ АДНОСІНЫ?

Не памылюся, калі скажу, што пераважная большасць людзей на планеце марыць пра моцную і шчаслівую сям'ю. Але далёка не ва ўсіх гэта мара збываецца. Колькасць разводаў з кожным годам расце... «Чамусьці многія, калі выходзяць з загса, забываюцца на тое, што над адносінамі трэба працаваць», — піша ў сваім блогу шчаслівы муж і тата Крысціян Рэй — прадзюсар крэатыўнага агенцтва Hollywood World. І дзеліцца ўласным досведам у выглядзе парад.

1. Навучыцеся прасіць прабачэння. Шчыра. Без прызнання ўласнай віны не бывае сапраўднай блізкасці паміж людзьмі.

2. Не насіце на сэрцы крыўду. Гэта ўрэшце вас загубіць.

3. Кажыце «КАХАЮ» часта і на ўсе лады. Словы «Ты і так ведаеш, што я цябе кахаю» забудзьцеся назаўжды.

4. Хадзіце на спатканне адно з адным, прычым часта. Рабіце адно аднаму прыемнае. Дарыце кветкі, гатуйце нечаканыя святочныя вячэры.

5. Не адмаўляйце адно аднаму ў сексе. Секс — гэта свята кахання. Ён аб'ядноўвае сэрцы і разбурае сцены паміж каханымі.

6. Не расставайцеся надоўга; ніякая праца ці хобі не могуць быць важнейшымі за сям'ю.

7. Сябруйце з тымі, хто шануе сям'ю. Дрэнная кампанія псуе характар чалавека.

8. Забудзьцеся на слова «развод». Ніколі не выкарыстоўвайце яго, каб прыстрашыць партнёра.

9. Праводзьце шмат часу з дзецьмі. Не пакідайце іх надоўга на бабу, дзеда і на нянек. Яны вашы, ім патрэбны менавіта вы.

10. Замест таго, каб купляць дзецям усё без разбору, трэніруйце іх характар, розум і волю.

11. Шмат размаўляйце адно з адным і дзецьмі. Выключыце тэлевізар і камп'ютарныя гульні. Кантактуйце часта і доўга. Абмяркоўвайце тое, што вас радуе, дзяліцеся тым, што вас турбуе.

12. Навучыцеся пераключацца з рэжыму «Як бы мне зрабіць па-свойму» у рэжым «Як бы палепшыць жыццё каханага чалавека».

13. Захоўвайце пачуцці, якія аднойчы паміж вамі разгарэліся, як скарб. І памятайце — па-сапраўднаму шчаслівыя дзеці вырастаюць толькі ў шчаслівай сям'і.

Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА

■

МУЖ ДЫ ЖОНКА СПЯВАЮЦЬ ЗВОНКА

Колькі на свеце прымавак пра мужа ды жонку — не злічыць! А жыццё падказвае ўсё новыя ды новыя. На рэспубліканскім фестывалі фальклору я пачуў яшчэ адну — пра тых, хто любіць паспяваць ды патанчыць. Яўгенія і Уладзімір Ісайкі з аграгарадка Сарачы Любанскага раёна ведаюць шмат народных песень ды бытавых танцаў. Разам з іншымі мясцовымі аматарамі фальклору яны выступаюць у складзе гурта «Расіца». Гэты калектыў адраджае старыя спевы, найгрышы, прыпеўкі, абрады, танцы.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

■ У бацькоўскі нататнік

Казачка на здароўе

Казкі патрэбны не толькі для таго, каб дзецям весялей засыналася. З іх дапамогай можна даведацца пра праблемы малога, скарэктаваць яго паводзіны, навучыць лічыць ды развіць фантазію. Пра магчымасці казкатэрапіі пагаварылі з арт-тэрапеўтам Галінай САВЕЛЬЕВАЙ.

— Якія казкі лепш расказваць дзіцяці — свае, народныя ці аўтарскія?

— Абавязкова трэба чытаць народныя казкі, у іх закладзеныя глыбокія сэнсы!

Аўтарскія звычайна прысвячаюць пэўнай праблеме. Да іх можна звяртацца, але выбіраць тыя, што падабаюцца, блізкія па духу. Калі тэма казкі актуальная для вашай сітуацыі, вазьміце яе за аснову, але абавязкова дадайце што-небудзь сваё, індывідуальнае.

Гісторыі, прыдуманыя самімі бацькамі, дазваляюць найбольш поўна абыграць рэчаіснасць, актуальную для дзіцяці.

Вось, напрыклад, мая лялька — цацачная варона — прыляцела ў анкабальніцу. Яна залятае туды, і бачыць нікім не кранутую ежу. Там дзеці наогул часта не ядуць. Варона пачала каркаць: «Вох, я зараз наемся, такі класны суп і макарона! Вой, і гэта, і вось гэта, усё-ўсё з'ем». І тут адзін хлопчык: «Не, я з'ем». «Дакладна ты з'ясі? А ну пакажы, пакажы!» І дзіця пачынае есці. Таму гатовыя сюжэты, нарыхтоўкі могуць быць, але лепш, калі яны нараджаюцца ў галаве штохвілінна. Вы ж не пабяжыце адразу шукаць у інтэрнэце казку, у якой дзіця не есць. Прасцей і хутчэй прыдумаць на месцы, абыграць сітуацыю.

— Ведаю, што многіх сучасных бацькоў бянтэжыць жорсткасць народных казак.

Ілюстрацыя да казкі Алены Мальчэўскай «Ша-ша з левага чаравіка». Мастак Таццяна Дзівакова.

— Ёсць такая праблема. У нас нават на фестывалі батлеек была дыскусія на тэму, ці трэба прыбіраць з сучасных батлеечных містэрый крывавыя сцэны. Напрыклад, калі воін забівае дзіця ці калі адсякаюць галаву Іраду.

Калісьці я сама прыбрала ўсе гэтыя сцэны са сваіх спектакляў. Думала, навошта я буду паказваць дзецям, як адсякаюць галаву, хай нават злыдню. Людзі раней былі больш гатовыя да такіх жорсткіх сцэнак, успрымалі іх нармальна, былі больш цяжкія ўмовы жыцця.

Цяпер я ўжо не так катэгарычна да гэтага стаўлюся. Выступаю, каб ператвараць гэта ўсё ў трагіфарс, выкарыстоўваць гумар. Але, вядома, нічога нельга даводзіць да абсурду.

— Калі дзіця само прыдумляе казку, ці трэба яму дапамагаць?

— Калі ёсць магчымасць не ўмешвацца, то лепш не ўмешвацца. Калі ў дзіцяці ёсць цяжкасці ў складанні казкі, нейкі ступар, тады трэба дапамагчы, але вельмі мякка, у выглядзе пытання: «А можа быць, вось так?»

Сёння ў дзяцей вельмі часта ў казках сустракаюцца такія матывы — усіх забілі, кругом вампіры, паўсюль кроў. Яны як бы зацыкліваюцца на вобразах, якія ўбачылі па тэлевізары, і пераносяць іх у свае апавяданні і казкі. У гэтым выпадку бацькам трэба ўмяшацца, перайграць сюжэт, прапанаваць новы варыянт развіцця падзей. Але паўтаруся, зрабіць гэта варта ў выглядзе прапановы, а не аўтарытэтнай заявы.

— Як распавядаць казкі не банальным спосабам?

— Можна ўзяць добра вядомую вашаму дзіцяці казку і зрабіць з яе гульню. Можна расказаць яе на новы лад, памяняць усіх персанажаў. З дапамогай казкі прасцей навучыць дзіця лічыць, параўноўваць. Адзіная важная ўмова — першапачатковы варыянт народнай казкі малеча павінна ведаць. Далей ужо можна паэксперыментаваць. Але дзіця мусіць ведаць, што гэта эксперымент, каб сама сутнасць казкі не скажалася.

Можна паспрабаваць візуалізаваць любімых персанажаў. Напрыклад, часта бацькі выкарыстоўваюць у выхаваўчых мэтах ужо вядомыя вобразы. Напрыклад, дзеда Мароза эксплуатуюць, каб дамагчыся ад дзіцяці добрых паводзінаў. Але можна стварыць свой вобраз са сваёй уласнай гісторыяй. Яго можна намаляваць, вылепіць, зрабіць ляльку, і гэты персанаж будзе вам памочнікам у выхаванні, ён можа ўдзельнічаць у жыцці дзіцяці, дапамагаць яму рабіць урокі. І ператвараць выхаванне ў цікавую гульню.

Алена ХУРС

■ Маміны дзённікі

ШАРЫК... СХУДНЕЎ

Даню пастрыглі.

— Які ты прыгажун! — кажу. — У дзіцячым садку дзеці заўважылі тваю новую прычоску?

— Так. Але ж яны не казалі, што я прыгажун, — сумна адказаў мой хлопчык.

☺ ☺ ☺

Малы просіць купіць робата з пультам кіравання.

— Дорага каштуе, — адказваю яму.

— А ты пашукай на зніжках!

☺ ☺ ☺

— Мамачка, Максім мяне б'е, — жаліцца сын.

— Дык і ты ж яго ў адказ лупіш.

— Гэта мы так сябруем, — тлумачыць з усмешкай малы.

☺ ☺ ☺

— Даня, не цягай Кацю (кошку), у яе хутка будуць кацяняты, — тлумачу сыну.

— Не-е, гэта яна косткамі аб'елася.

☺ ☺ ☺

Сын разважае ўслых пра тую ж кошку Кацю:

— Раней, калі я быў здаровы, Каця мяне часам драпала. А цяпер я захварэў, і яна ніводнага разу мяне не падрапала. Не думаў, што кошкі могуць мяняцца...

☺ ☺ ☺

— Чаму ў цябе калготкі задам наперад надзеты? Вось бачыш дзве палосачкі, яны павінны быць ззаду.

— Калі б гэтыя палоскі былі каляровымі, я б іх заўважыў, — патлумачыў малы.

☺ ☺ ☺

— Мамачка, патэлефануй прэзідэнту, — просіць Даня, — і скажы, што наш хлопчык хоча заўсёды мульцікі глядзець. А заўсёды не ідуць...

☺ ☺ ☺

Паветраны шарык здзьмуўся.

— Ой, глядзі, шарык схуднеў! — засмуціўся Даня.

☺ ☺ ☺

Даня ўбачыў здохлага камара.

— Тата, камарык памёр.

— Камары кепскія, іх трэба забіваць, — чуе ў адказ.

— Не кажы так! — закрычаў сын. — Гэта ж маленькі камарык. Яго мама чакае.

☺ ☺ ☺

Муж вязе сына з дзіцячага садка. Па радыё гучыць знаёмая песня.

— Даня, падпявай мне, — заклікае сына.

— Ты лепш за дарогай сачы, — сур'ёзна адказаў той.

☺ ☺ ☺

Малы ўбачыў у акне шмат дзяцей.

— О, цэлы статак ідзе!

☺ ☺ ☺

— Бачыш, як дрэнна атрымалася. У таты сёння дзень народзінаў, а мы ў бальніцу трапілі, — кажу сыну.

— Гэта нічога, — супакойвае ён мяне. — Мы потым яго свята ў Макдональдсе адзначым!

☺ ☺ ☺

Едзем усе разам (з бабуляй і дзядулем) на машыне. Я дастала чыпсы і ем. Даня таксама просіць даць яму.

Дала трохі і кажу, што яны шкодныя, шмат есці нельга.

— Давай усіх пачастуем, каб табе менш шкодных чыпсаў засталося, — хуценька скеміў сынок.

☺ ☺ ☺

Муж прынёс дадому гітару і кажа, што будзе Даню вучыць на ёй іграць.

— І мяне навучы, — прашу я.

— Ну, трымайцеся, суседзі, мама будзе іграць! — пажартаваў з мяне малы.

☺ ☺ ☺

— Мама, ты абяцала са мною пагуляць.

— Зараз, толькі давай прыбяром лішнія цацкі.

— Вось я і хацеў пагуляць у такую гульню: «Хто мне дапаможа прыбраць цацкі?»

☺ ☺ ☺

— Ты не даеў банан.

— Няхай тата даесць, ён у нас заўсёды галодны.

☺ ☺ ☺

Муж спрабуе прыцягнуць малога да прыбірання кватэры:

— Давай дапаможаш мне!

— Не, я лепш буду камандаваць!

Запісала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.

А пра што гавораць вашы дзеці?

ЧАРОЎНЫ СВЕТ ВАРВАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»)

Кніга Алены і Вары складаецца з дзесяці казачных гісторый, у якіх расказваецца аб прыгодах маленькага ляніўца Чудзілёныша і яго мамы Чудзілены. Аснову для ўсіх гісторый і імёны персанажаў прыдумала дзяўчынка, а мама запісала і апрацавала апавяданні — гэта і ёсць «разыначка» праекта.

— У 2 гады Вара стала называць сябе Чудзілёнышам, а мяне — матуляй Чудзіленай, — успамінае Алена. — Гэта было проста міла, але не больш за тое, бо дзеці часта нешта прыдумляюць. З часам я пачала прыслухоўвацца да таго, што балбоча Вара, і спачатку падумала, што Чудзілёныш — проста яе выдуманы сябар. Але ўсё аказалася значна цікавей: гэта былі яе казкі! Я пачала запісваць за ёй — так нарадзілася цэлая кніга.

Алена прызнаецца, што ўмее слухаць сваю дачку. Для яе не бывае глупства ў тым, што гаворыць маленькая Вара — усе фантазіі і словы дзяўчынкі важныя для мамы.

Аснову для ўсіх гісторый і імёны персанажаў прыдумала дзяўчынка, а мама запісала і апрацавала апавяданні.

— Я веру, што дзеці могуць бачыць і чуць тое, чаго ўжо не бачым і не чуем мы, дарослыя. Нездарма ж кажуць: вуснамі дзіцяці гаворыць ісціна.

Акрамя ляніўца Чудзілёныша і яго маці ў чароўным ружовым лесе можна сустрэць храбрую пчолку Пенябіпку, дзякуючы якой казачны лес выратавалі ад раптоўнай зімы, дзядулю Эспэна і цётачку Разарыю, фей Кларысу і Марысу, доктара Розазуба. Але самы любімы персанаж самой Алены — крыху сумны мудрэц і філосаф вусень Бабу Ба Біба.

— Прататыпаў у рэальным жыцці ў казачных герояў няма, — працягвае Алена. — Вара называла імёны — я іх запісвала. А потым самі сабой нараджаліся такія не падобныя адзін на аднаго вобразы. Думаю, увесь сакрэт у тым, што паміж мной і дачкой існуе нейкая таямнічая творчая прастора. Мне здаецца, я бачу яе герояў вельмі ясна.

Сёння Алена і Вара прайшлі доўгі шлях да таго, каб кніга трапіла ў рукі сваім маленькім чытачам. Літаратурны рэдактар вычытаў і ўнёс змяненні ў тэкст, прафесійны ілюстратар стварыў яркія і цёплыя ілюстрацыі, каманда неабыякавых людзей падрыхтавала краўдфандынгавую кампанію (народнае фінансаванне), каб сабраць грошы на выданне кнігі, а некалькі выдавецтваў ужо гатовы ажыццявіць мару дзвюх пісьменніц.

— Над вобразам Чудзілёныша працавала ў першую чаргу мастачка — Кацярына Марціновіч, якая вельмі тонка адчувае тэкст. Карэкціроўка праходзіла з удзелам арт-дырэктара праекта Вольгі Алейнік і, вядома, мяне. Вобраз Чудзілёныша некалькі разоў трансфармаваўся, але заўсёды ўзгадняўся з Варай. Яе першая рэакцыя на героя была вырашальнай для каманды.

Сёння Алена марыць аб перакладзе кнігі на беларускую мову.

— Для мяне гэта вельмі важна. Я люблю мову, але, на жаль, пакуль не магу на ёй пісаць так тонка, як на рускай. Гэта мая зона развіцця як аўтара на будучыню. Першы наклад будзе без беларускай версіі, але наступны мы абавязкова выдадзім на абедзвюх мовах — рускай і беларускай. Ці будзе ў кнігі працяг? Думаю, мы з Варай што-небудзь прыдумаем. Зараз важна выдаць першую кнігу.

Кнігу Алена раіць прачытаць не толькі дзецям, але і іх бацькам — каб лепей разумець перажыванні маленькага чалавечка, які толькі пачынае спазнаваць свет праз радасці, страхі і мноства самых розных «чаму». А на пытанне «Як глядзіце на тое, што аднойчы Вара сама захоча стаць пісьменніцай?» маладая мама шчыра ўсміхаецца і адказвае: «Я буду шчаслівая падтрымаць яе ў любым выбары».

Ганна БАГІНО.

Фота з архіва герояў.

«Я не баюся выглядаць смешнай»

«Вучыла сына жангліраваць трыма бульбінамі»

— Вам з такой бабуляй, пэўна, сумаваць не даводзіцца? — *звяртаюся да малых.*

— Не, — смяюцца ў адзін голас.

— Бачылі б вы, як мы ўчора абмазаліся з імі з ног да галавы, — кажа Галіна Анатолеўна і паказвае на свежыя плямы на канапе. — Пачалі са звычайных ценяў і пудры. А потым я дастала свой прафесійны грым… Маляваць на твары — гэта ж цікавей, чым на паперцы, пагадзіцеся. У мяне вунь у той шафе некалькі мяхоў з яркімі касцюмамі, парыкамі. Унукі любяць, калі я іх дастаю і дазваляю ім пераапранацца (*крыху пазней мы ў гэтым пераканаліся на ўласныя вочы.* — **Аўт.**)... Сваю задачу як бабулі я бачу не ў тым, каб напячы ім тазік бліноў, хоць і гэта можна. А каб прывіць ім упэўненасць у сваіх сілах, развіць творчы патэнцыял, захаваць дзіцячую непасрэднасць, здольнасць захапляцца, марыць.

«Лічу, што клаўнес павінна быць больш. Бо чым больш вясёлых жанчын, тым больш шчаслівых сем'яў».

— Галіна Анатолеўна, як так атрымалася, што вы — інжынер-эканаміст — сталі клаўнесай?

— Яшчэ Канфуцый казаў: «Выберы прафесію па душы — і табе не прыйдзецца працаваць ні дня». Я так і зрабіла. Прапрацаваўшы пяць гадоў эканамістам, падумала: «Няўжо так сумна пройдзе ўсё маё жыццё?» І ў 30 гадоў кардынальна змяніла прафесію. Можна сказаць, скарысталася шанцам, які падкінуў лёс. Майго мужа ў гэты час забралі ў армію, і я, як жонка афіцэра ў запасе, паехала з ім у Брэст. Там мне працы па спецыяльнасці не знайшлося, ды і дачку маленькую не было з кім пакінуць, таму я ўладкавалася нянечкай у дзіцячы сад. А выхавальнікі, як вядома, бываюць і Дзедам Марозам, і Снягуркай, і клоўнам. Калі вярнуліся жыць у Мінск, я абышла ўсе дамы культуры, як Алена Верабей, з просьбай: «Ну, вазьміце мяне». Вядома, ніхто не ўзяў. Прапаноўвалі розныя пасады: эканаміста, бухгалтара, касіра. «Не, — сказала, — не хачу». І запісалася ў тэатральны гурток. Менш як праз год я, фанатка-самавучка, ужо была загадчыцай аддзела ў Доме культуры. А яшчэ праз нейкі час прадстаўляла краіну на ўсесаюзным конкурсе ў Анапе.

— А як нарадзіўся ваш творчы псеўданім?

— Неяк перад Новым годам дырэктар Дома культуры выклікаў творчую групу, каб размеркаваць ролі. Я, як вядучая, павінна была па сцэнарыі выйсці на сцэну ў традыцыйным «белы верх, чорны ніз». Мне здалося, што гэта сумна. Таму прыбегла дадому, знайшла чырвоныя брыджы, у якіх калісьці выступала клоўнам у дзіцячым садку. Нашыла на іх белыя гарошыны, якія выразала з прасціны. Пасля прыгадала, што на плоце пішуць розныя словы. Выразала з той жа прасціны літары «Л», «Ю», «С» і «Я» і таксама прышыла да майкі. Мой экспромт гледачы ўспрынялі на ўра. З таго часу мяне і празвалі Люсяй. Так зусім выпадкова прышыла сабе творчае імя.

— Не баяліся быць смешнай?

— Не. Я даўно думала: чаму ў нас так мала клаўнес, у асноўным клоўны? І зразумела: напэўна, таму, што жанчыны баяцца быць смешнымі, пастаянна азіраюцца на чужое меркаванне, турбуюцца, каб усё было «так, як у людзей». А я заўсёды імкнулася шукаць свой шлях. Дарэчы, штуршок мне дала Мая Гагулан. Калісьці, 25 гадоў таму, загадчыца клуба прапанавала схадзіць на яе выступленне. Я тады не ведала, хто такая Мая Гагулан. Але ўсе пайшлі, і я пайшла. Аказалася, што на гэтай жанчыне дактары ставілі крыж, а яна не здалася і вылечыла сябе ад раку нетрадыцыйным спосабам. Дзякуючы Маі Гагулан я зразумела, што любое пытанне варта паспрабаваць вырашаць нязведаным шляхам. І стварыла свой унікальны тэатр гульні і клаўнады «Жарт», да якога пасля далучылася ўся мая сям'я.

— Ваша дачка скончыла інстытут культуры, сын — прафесійны цыркавы клоўн. Калі б вы ў свой час не змянілі нелюбімую прафесію, магчыма, і ў вашых дзяцей лёс склаўся па-іншаму?

— Так, атрымліваецца, я заснавальніца творчай дынастыі Сушыцкіх. Заразіла клаўнадай усю сям'ю. Калі дачцэ было тры годзікі, яна атрымала свой першы заробак. Мне трэба было быць цыганкай на дзіцячым свяце. Волечку не было куды падзець, дык я сшыла ёй цыганскую спадніцу і вадзіла за сабой. Сын таксама вырас на сцэне, за кулісамі. Кар'ера ж яго пачалася з кліпа песні «Мая любоў — паветраны шар» гурта «Белы Арол». Цырку патрэбны былі людзі для масоўкі. І Паша, яму тады гадоў 19 было, зусім выпадкова прыйшоў туды замест сястры. У гэты час прыехала здымачная група гурта «Белы арол». Шукалі на галоўную ролю маладога чалавека, падобнага на Сяргея Ігнатава — беларускага жанглёра, які ўвайшоў у кнігу рэкордаў Гінеса. Падышлі да сына і спыталі: «Жангліраваць умееш?» — «Не». — «За тыдзень навучышся хоць бы трыма шарыкамі?» Паша прыбег дадому і сказаў: мама, вучы мяне жангліраваць. Я ўзяла тры бульбіны (ну што было пад рукой), і мы адразу пачалі вучыцца. На здымках кліпа сын даведаўся, што пры музычным вучылішчы імя Глінкі адкрываецца цыркавое аддзяленне, і прайшоў туды адбор. Некалькі гадоў таму на міжнародным конкурсе дуэт «Браты Засценчывыя» (*Павел Сушыцкі выступае разам з напарнікам.* — **Аўт.**) сталі «Залатымі клоўнамі Еўропы».

Канфлікт баіцца жартаў

— Галіна Анатолеўна, вы і цешча, і свякроў у адной асобе. Ёсць нейкі сакрэт, каб захаваць добрыя адносіны і з абраннікамі сваіх дзяцей?

— Як сказала гераіня фільма «Масква слязам не верыць», трэба навучыцца кіраваць трыма чалавекамі, а пасля колькасць не мае значэння. Таму калі сям'я вялікая і ты наладзіў добрыя адносіны

Сваю задачу як бабулі Галіна Анатолеўна бачыць не ў тым, каб напячы ўнукам тазік бліноў.

хаця б са сваімі мужам і дзецьмі, то і з зяцем і нявесткай зможаш знайсці агульную мову. Галоўнае, каб было жаданне дамаўляцца.

— А гумар вам неяк дапамагае згладзіць канфлікты і непаразуменне?

— Безумоўна. Памятаеце песню: «Пускай, капризен успех, он выбирает из тех, кто может первым посмеяться над собой». Заўсёды можна любую канфліктную сітуацыю згладзіць нейкім жартам у свой адрас. Мне шчыра шкада людзей, якія марнуюць жыццё на высвятленне адносін, прад'яўленне прэтэнзій. У мяне калісьці была мара стварыць жаночую клаўнаду. Бо чым больш вясёлых жанчын, тым больш шчаслівых сем'яў.

У кватэры клаўнесы некалькі мяхоў з яркімі касцюмамі ды парыкамі. Унукі любяць іх даставаць і пераапранацца.

— А як муж ставіцца да вашых пераўвасабленняў, паваротаў лёсу?

— Заўсёды падтрымлівае. Я адчуваю надзейны тыл за плячыма. Анатоль — канструктар. Усё жыццё ён пра нешта думае, штосьці піша і лічыць. Я не пытаюся, што ён лічыць. Але прымушаю яго хадзіць на нашы канцэрты (*смяецца*). Былі часы, калі муж удзельнічаў у сямейных выступленнях, але калі сталі з'яўляцца ўнукі, камусьці трэба было сядзець з імі. І яму гэты занятак, па шчырасці, больш даспадобы.

«Дзеці, зрабіце сумныя твары. А цяпер вясёлыя, закаханыя...» Адно задавальненне назіраць, як артыстычна малыя выконваюць бабуліны каманды.

«Веру не веру — праверу»

— Галіна Анатолеўна, па тэлефоне вы мне сказалі, што вырашылі чарговы раз змяніць прафесію...

— Так, я вырашыла пачаць працаваць у маштабах сусвету. Буду дапамагаць людзям выходзіць з крызіснай сітуацыі і рэалізоўваць іх мары — праводзіць майстар-класы, як стаць багатым і шчаслівым. Многія ў 40—50 гадоў незадаволены сваім жыццём, але пры гэтым кажуць, што позна нешта мяняць. Я гэтага не разумею. Што значыць позна? Чаму чалавек у 17 гадоў можа асвоіць новую прафесію, напрыклад, а ў 58 — не? Ён што, падурнеў за гэтыя гады, ці што?

Больш за палову людзей на зямлі не маюць мары. А каб мару рэалізаваць, трэба яе вельмі дакладна ўяўляць. Гэта можна развіваць у сабе, як і ўсе астатнія навыкі. Калі я папрашу вас зараз напісаць 100 мараў. Страшна? Я раней таксама не магла, заганяла сябе ў рамкі. А зараз напішу 101 і расфарбую рознымі колерамі. Калі вам скажуць, напрыклад: «Прыклейце зялёны квадрат у пэўнае месца па компасе, і ў вас будуць грошы». Большасць пасмяецца, развернецца і пойдзе. А я жыву па прынцыпе: веру не веру — праверу. Усё ж пачынаецца з думкі.

— А самі пра што марыце?

— Ёсць вельмі вялікая мара звазіць усіх сваіх унукаў у Дыснейлэнд. Я чамусьці парыжскі ўяўляю. На днях мы з дзецьмі абмяркоўвалі, як паедзем у Аўстралію на месяц і будзем займацца сёрфінгам. Ёсць мара здзейсніць кругасветнае падарожжа. Я ўжо пачала прапрацоўваць сабе маршрут: напрыклад, у Японіі планую паплаваць у басейне з сакэ, у Тайландзе — зняць самалёт першага класа са spa-салонам у кабіне. У Ісландыі ёсць гасцініца, зробленая з лёду. Я не думаю, што надоўга там спынюся. Але паглядзець цікава. Як бачыце, кругасветнае падарожжа можа быць актуальным у любым узросце. Але яшчэ некалькі гадоў таму так далёка марыць я не адважвалася.

Мару пра такую сядзібу за горадам, дзе мы з мужам і дзеці са сваімі вялікімі сем'ямі жывём побач, але асобна. А паблізу з нашымі дамамі — зала месцаў на 150 з паўкруглай арэнай-сцэнай, дзе кожны з нас мог бы сябе рэалізоўваць, займацца сваёй справай.

Я ўжо знайшла спосаб ажыццявіць свае мары. Кажуць, быццам бы крызіс у людзей. Але я зразумела, што было б жаданне зарабіць грошы, магчымасці знойдуцца. Вось у нас 6 дарослых чалавек у сям'і і як мінімум 7 новых праектаў на верасень. Зяць арандаваў у Радашковічах закінуты кінатэатр «Мір». Плануе зрабіць там караоке-бар, праводзіць дыскатэку як для дарослых, так і для дзяцей з героямі розных мультыкаў. У дачкі — праект пазнавальных праграм па школах. Сын цяпер гастралюе з цыркам-шапіто. Ён мне пазаўчора сказаў, што яшчэ бурэннем свідравін будзе займацца. Нявестка выкладае ў мастацкай студыі. Нядаўна яна, маці чацвярых дзяцей, падрыхтавалася да цэнтралізаванага тэсціравання і на роўных умовах са школьнікамі паступіла ў інстытут. Сёлета ў яе новы праект — інтэр'ерныя лялькі, якія яна лепіць сваімі рукамі. І валеннем пачала займацца, карціны з воўны робіць. Яна якраз зараз на чарговых курсах. Усяго можна дабіцца, калі працаваць і марыць. Мары ж падаткамі не абкладаюцца.

Тры гадзіны з бабуляй-клаўнесай і яе ўнукамі праляцелі незаўважна. Мы гушкаліся на арэлях, бегалі з горкі, елі марожанае, спявалі, прымяралі яркія касцюмы і парыкі, расфарбоўвалі адно аднаму шчокі чырвонай памадай. ...Вось з працы вярнуўся Анатоль Сушыцкі, за сваімі сыночкамі прыйшла дачка Вольга. Пакуль мы знаёмімся, Галіна Анатолеўна працягвае камандаваць парадам: «Хто збярэ касцюмы і парыкі з падлогі — таго чакае сюрпрыз». Шчыра прызнацца, ніколі не бачыла, каб дзеці з такой ахвотай, навыперадкі, кінуліся наводзіць парадак. «Што за сюрпрыз?» — цікавімся ў Галіны Анатолеўны. «Я яшчэ не вырашыла, — інтрыгуе. — Магчыма, мы з мужам зараз пойдзем у двор і закапаем там некалькі капеек. А потым разам з унукамі будзем шукаць скарб. Затым я павяду іх у краму (гэта цэлае дзейства: мы становімся парамі і спяваем песні), і кожны выбера свае любімыя цукеркі. А я буду любавацца, як яны выбіраюць. Ведаеце, можна ж было адразу сказаць: таму, хто прыбярэцца, я куплю 100 грамаў цукерак. Але ж гэта зусім не цікава».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
dryla@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»)

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 41 72-95, тел./факс 41-80-30

Предмет аукциона (реализуется одним лотом)
Месторасположение: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54Б

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер
Бытовое здание	55,5 кв.м.	250/С-36285
Бытовое здание кладовщика (в т.ч. терасса)	14,3 кв.м.	250/С-36290
Гараж	19,9 кв.м.	250/С-36287
Гараж №2	21 кв.м.	250/С-36291
Профилакторий для автомашин, склад	782,3 кв.м.	250/С-36286
Канализационная сеть	-	250/С-39742
Тепловая сеть	-	250/С-39970
Склад с мастерскими	693 кв.м.	250/С-36289

Составные части принадлежности: две пристройки, рампа, ограждение (кирпичное, сборные ж/б плиты), ворота, в т.ч. водопроводная сеть

С перечнем машин, оборудования, прочих основных средств, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь) и временных сооружений, входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

Обременения: Аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by

Начальная цена с НДС 20 % – 212 188 рубля 98 копеек (2 121 889 800 бел. руб.)

Шаг аукциона **10 610 рублей 00 копеек (106 100 000 бел. руб.)**

Сведения о земельном участке: для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 2,0897 га. Обременения: охр. зона систем газообеспечения и др. линейных инженерных сооружений, пл. 0,0390 га; охр. зона ЛЭП, напряжением свыше 1000 В, пл. 0,2460 га

Порядок ознакомления: ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон +375333360220

Предмет аукциона

Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

№ лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год выпуска	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС
1	01071	Автомобиль МАЗ 5516 А5 (рег. знак АВ 5416-2), 2008 г.в.	12 112,80 (121 128 000)	605,64 (6 056 400)
2	01072	Автомобиль МАЗ 5516 А5 (рег. знак АВ 5417-2), 2008 г.в.	12 112,80 (121 128 000)	605,64 (6 056 400)
3	01119	Автомобиль VAZ 21074 (рег. знак 5399 ВТ), 2000 г.в.	495,60 (4 956 000)	24,78 (247 800)
4	01121	Автомобиль ВАЗ-21074 (рег. знак 8653 ВА), 2001 г.в.	411,60 (4 116 000)	20,58 (205 800)
5	01122	Автомобиль VAZ 21074 (рег. знак 8724 ВТ), 2001 г.в.	495,60 (4 956 000)	24,78 (247 800)
6	01138	Автомобиль GAZ-3302 (рег. знак АЕ 3412-2), 2006 г.в.	4 435,20 (44 352 000)	221,76 (2 217 600)
7	01127	Автомобиль ГАЗ 33073 (рег. знак 7886 ВТР), 1993 г.в.	1 570,80 (15 708 000)	78,54 (785 400)
8	01067	Автомобиль GAZ-52 (рег. знак ВА 9631),	1 058,40 (10 584 000)	52,92 (529 200)
9	01016	Автомобиль GAZ-5312 (рег. знак АА 9426-2)	1 293,60 (12 936 000)	64,68 (646 800)
10	01005	Автомобиль ЗИЛ 131 (рег. знак ВА 2045),1977 г.в.	2 839,20 (28 392 000)	141,96 (1 419 600)
11	01021	Автомобиль ЗИЛ – 441510 (рег. знак 8989 ВТР), 1990 г.в.	1 881,60 (18 816 000)	94,08 (940 800)
12	01140	Автомобиль ЗИЛ 5301 ВЕ (рег. знак АА 4254-2), 2006 г.в.	2 646,00 (26 460 000)	132,30 (1 323 000)
13	01001	Автомобиль КАМАЗ 5410 (рег. знак 6804 ВТП), 1978 г.в.	1 932,00 (19 320 000)	96,60 (966 000)
14	01012	Автомобиль КРАЗ 255В (рег. знак 7111 ВТП), 1974 г.в.	3 754,80 (37 548 000)	187,74 (1 877 400)
15	01137	Автомобиль MAZ 544008-030-021 (рег. знак АЕ 5727-2), 2005 г.в.	7 114,80 (71 148 000)	355,74 (3 557 400)
16	01143	Автомобиль МАЗ 555102 220 (рег. знак АА 5814-2), 2006 г.в.	6 115,20 (61 152 000)	305,76 (3 057 600)
17	01144	Автомобиль МАЗ 555102 220 (рег. знак АА 5815-2), 2006 г.в.	6 115,20 (61 152 000)	305,76 (3 057 600)
18	01148	Автомобиль МАЗ 6422 05-220 (рег. знак АА 7225-2), 2007 г.в.	10 869,60 (108 696 000)	543,48 (5 434 800)
19	01157	Автомобиль MAZ 6422А8 (рег. знак АЕ 2203-2), 2008 г.в.	9 248,40 (92 484 000)	462,42 (4 624 200)
20	01090	Автомобиль ММЗ-4502 (рег. знак 6707 ВТР), 1992 г.в.	1 134,00 (11 340 000)	56,70 (567 000)
21	01503	Полуприцеп MAZ 9758 030 (рег. знак А 3110 А-2), 2005 г.в.	3 889,20 (38 892 000)	194,46 (1 944 600)
22	01507	Полуприцеп МАЗ 938662 (рег. знак В 2156 А), 2006 г.в.	2 578,80 (25 788 000)	128,94 (1 289 400)
23	01505	Полуприцеп ОДАЗ 93571 (рег. знак 6983 ВМ), 1990 г.в.	680,40 (6 804 000)	34,02 (340 200)
24	01511	Полуприцеп MAZ 938662 (рег. знак А 0701 А-2), 2008 г.в.	3 049,20 (30 492 000)	152,46 (1 524 600)
25	01043	Автомобиль ГАЗ 3507 (рег. знак А 9425-2)	1 638,00 (16 380 000)	81,90 (819 000)
26	01134	Автомобиль ЗИЛ 131В1 (рег. знак ВА 9511), 1980 г.в.	1 932,00 (19 320 000)	96,60 (966 000)
27	01078	Автомобиль МЗКТ 74171 (рег.знак АЕ 1057-2), 2009 г.в.	36 178,80 (361 788 000)	1 808,94 (18 089 400)
28	01142	Автомобиль МАЗ 551605 (рег. знак АА 5763-2), 2006 г.в.	12 012,00 (120 120 000)	600,6 (6 006 000)
29	01063	Автобетоносмеситель СМБ-270 (рег. знак АА 9729-2), 2007 г.в.	5 796,00 (57 960 000)	289,8 (2 898 000)
30	01064	Автобетоносмеситель СМБ-270 (рег. знак АА 9728-2), 2007 г.в.	5 796,00 (57 960 000)	289,8 (2 898 000)
31	02403	Автокран КС-45729А-4 МАЗ 5337 (рег. знак АВ 4700-2), 2008 г.в.	24 696,00 (246 960 000)	1 234,80 (12 348 000)
32	02406	Автокран КС-55727-7 22 MAZ 6303А3 (рег. знак АВ 9479-2), 2009 г.в.	28 938,00 (289 380 000)	1 446,90 (14 469 000)
33	03324	Бульдозер Б10М0111-1В (рег. знак 50), 2006 г.в.	10 332,00 (103 320 000)	516,6 (5 166 000)
34	03330	Погрузчик с бортовым поворотом Амкодор 211	11 869,20 (118 692 000)	593,46 (5 934 600)
35	03410	Прицеп тракторный 2ПТС-4,5, 2006 г.в.	1 054,20 (10 542 000)	52,71 (527 100)
36	01146	Автомобиль МАЗ 555102 220 (рег. знак АА 72-21), 2007 г.в.	6 451,20 (64 512 000)	322,56 (3 225 600)
37	02151	Транспортное устройство, 1984 г.в.	4 704,00 (47 040 000)	235,2 (2 352 000)
38	02218	Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в.	167 916,00 (1 679 160 000)	8 395,80 (83 958 000)
39	02219	Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в.	188 916,00 (1 889 160 000)	9 445,80 (94 458 000)
40	02220	Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в.	230 832,00 (2 308 320 000)	11 541,60 (115 416 000)
41	02237	Кран МТТ-16А, 1990 г.в.	11 340,00 (113 400 000)	567,00 (5 670 000)
42	02409	Подъемник мачтовый ПМГП-1500, 2010 г.в.	31 752,00 (317 520 000)	1 587,60 (15 876 000)
43	02410	Подъемник мачтовый ПМГП-1501, 2010 г.в.	31 752,00 (317 520 000)	1 587,60 (15 876 000)
44	02500	Захват 1ПТМ 791170г/п 10т, 2008 г.в.	1 008,00 (10 080 000)	50,4 (504 000)
45	02501	Захват 2ПТМ 791170г/п 5т, 2008 г.в.	1 260,00 (12 600 000)	63,00 (630 000)
46	03454	Дизмолот сваебойный МСДШ, 2008 г.в.	13 272,00 (132 720 000)	663,6 (6 636 000)
47	01135	Автомобиль ГАЗ 32213 (рег. знак ВВ 2808), 2005 г.в.	691,20 (6 912 000)	34,56 (345 600)

Порядок ознакомления: ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон +375292121501.

Предмет аукциона

Оборудование, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

№ лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год изготовления	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	05105	Станок сверлильный СМ-8П, 1993 г.	576,90 (5 769 000)	28,85 (288 500)
2	05106	Станок сверлильный СМ-8П, 1993 г.	576,90 (5 769 000)	28,85 (288 500)
3	05012	Станок токарный 16-К-20, 1989 г.	2 728,80 (27 288 000)	136,44 (1 364 400)
4	05162	Стенд для испытания гидросистем КИ-4815 М, 1985 г.	1 493,10 (14 931 000)	74,66 (746 600)
5	05041	Стенд профилактический "Star 12F", 1989 г.	2 349,90 (23 499 000)	117,50 (1 175 000)
6	05048	Пресс Р-337, 1991 г.	907,20 (9 072 000)	45,36 (453 600)
7	04003	Компрессор "Индия" мод. С 06010, 1989 г.	1 337,40 (13 374 000)	66,87 (668 700)
8	05163	Полуавтомат сварочный Solaris MULTMIG-220, 2015 г.	611,10 (6 111 000)	30,56 (305 600)
9	05078	Станок сверлильный 2С-132, 1992 г.	2 073,60 (20 736 000)	103,68 (1 036 800)
10	05079	Станок заточной 3Е-642, 1992 г.	2 324,70 (23 247 000)	116,24 (1 162 400)
11	05080	Станок плоскошлифовальный 3Д-711, 1992 г.	3 713,40 (37 134 000)	185,67 (1 856 700)
12	05081	Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г.	1 507,50 (15 075 000)	75,38 (753 800)
13	05082	Станок радиально-сверлильный, 1991 г.	3 272,40 (32 724 000)	163,62 (1 636 200)
14	05089	Станок фрезерный 6Т-80Ш, 1992 г.	4 980,60 (49 806 000)	249,03 (2 490 300)
15	05091	Станок точильно-шлифовальный Т-400, 1992 г.	1 034,10 (10 341 000)	51,71 (517 100)
16	05156	Сварочный аппарат Jasic ARC-315, 2007 г.	607,50 (6 075 000)	30,38 (303 800)
17	04002	Установка компрессорная К-24М, 2007 г.	528,30 (5 283 000)	26,42 (264 200)
18	05158	Молот ковочный МА 4129А, 1991 г.	3 486,60 (34 866 000)	174,33 (1 743 300)
19	00085	Газоанализатор "Инфракар" 08.01, 2009 г.	535,50 (5 355 000)	26,78 (267 800)
20	00086	Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г.	533,70 (5 337 000)	26,69 (266 900)
21	40018	Трансформатор ТСЗИ 380/36, 1993 г.	117,00 (1 170 000)	5,85 (58 500)
22	41218	Станок СМЖ-172 (ножницы для резки арматурной стали), 2006 г.	1 786,50 (17 865 000)	89,33 (893 300)
23	05155	Сварочный аппарат THMIG-200, 2007 г.	450,90 (4 509 000)	22,55 (225 500)
24	42021	Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г.	1 228,50 (12 285 000)	61,43 (614 300)
25	41040	Станок вертикально-сверлильный МН-18, 1996 г.	1 477,80 (14 778 000)	73,89 (738 900)
26	40015	Сварочный аппарат ВДМ-1201, 1991 г.	831,60 (8 316 000)	41,58 (415 800)
27	41244	Установка компрессорная СБ 4/Ф-500, 1989 г.	1 684,80 (16 848 000)	84,24 (842 400)
28	41039	Станок правильно-отрезной И61-22, 1991 г.	7 387,20 (73 872 000)	369,36 (3 693 600)
29	42069	Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г.	3 045,60 (30 456 000)	152,28 (1 522 800)
30	42022	Полуавтомат дуговой сварки ПДГ-351, 2007 г.	1 684,80 (16 848 000)	84,24 (842 400)
31	44170	Станок деревообрабатывающий ФСШ-1А (К), 2005 г.	3 834,00 (38 340 000)	191,70 (1 917 000)
32	44171	Станок деревообрабатывающий ЦТ-10/5м, 2005 г.	3 466,80 (34 668 000)	173,34 (1 733 400)
33	44092	Станок рейсмусовый МП-9-1695, 1998 г.	7 365,60 (73 656 000)	368,28 (3 682 800)
34	44174	Станок ленточнопильный "ПЛП-Астра-ЕС", 2006 г.	15 616,80 (156 168 000)	780,84 (7 808 400)
35	41229	Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г.	676,80 (6 768 000)	33,84 (338 400)
36	41230	Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г.	676,80 (6 768 000)	33,84 (338 400)
37	41231	Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г.	676,80 (6 768 000)	33,84 (338 400)
38	44600	Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г.	495,90 (4 959 000)	24,8 (248 000)
39	44601	Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г.	495,90 (4 959 000)	24,8 (248 000)
40	44227	Матрица С-640 с пневмопрессом, 2009 г.	2 613,60 (26 136 000)	130,68 (1 306 800)
41	44087	Станок деревообрабатывающий "Лучеса" УОДМ-1, 1992 г.	1 242,00 (12 420 000)	62,1 (621 000)
42	44088	Станок заточной ВШ-027 РЭ, 1992 г.	765,00 (7 650 000)	38,25 (382 500)
43	41222	Станок автоматический режущий Метеор-1, 2009 г.	3 618,00 (36 180 000)	180,9 (1 809 000)
44	41223	Станок пневматический фрезерный GALAXU-1, 2009 г.	2 991,60 (29 916 000)	149,58 (1 495 800)
45	41224	Станок автоматический фрезерный POLAR-IV, 2009 г.	2 095,20 (20 952 000)	104,76 (1 047 600)
46	41225	Станок для прессовки углов APEX, 1989 г.	7 959,60 (79 596 000)	397,98 (3 979 800)
47	05010	Станок вертикально-сверлильный МН-18н, 2009 г.	923,40 (9 234 000)	46,17 (461 700)
48	41228	Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г.	5 454,00 (54 540 000)	272,70 (2 727 000)
49	41043	Станок заточной ВШ-025, 1992 г.	221,40 (2 214 000)	11,07 (110 700)
50	41602	Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г.	495,90 (4 959 000)	24,8 (248 000)
51	44173	Станок деревообрабатывающий комбинированный Д-400, 2005 г.	5 407,20 (54 072 000)	270,36 (2 703 600)
52	41232	Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г.	676,80 (6 768 000)	33,84 (338 400)
53	41226	Двухголовочный сварочный станок DZW-500, 2009 г.	17 150,40 (171 504 000)	857,52 (8 575 200)
54	44172	Станок деревообрабатывающий круглопильный ДК-150, 2005 г.	9 147,60 (91 476 000)	457,38 (4 573 800)

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Порядок ознакомления: ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 13-00 до 14-00. Ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375296774509

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более **30** (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 "О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица". К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 23.07.2016 (недвижимость и иное имущество; транспорт и спецтехника), 05.07.2016 (оборудование)

Дата и время проведения аукциона 15.09.2016 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал	**в 11 ч. 00 мин. – недвижимость и иное имущество;** **в 12 ч. 00 мин. – транспорт и спецтехника;** **в 14 ч. 00 мин. – оборудование**

Дата и время окончания приема документов: 13.09.2016 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.
Email: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «БПХО» с понижением начальной цены продажи на 20 процентов

№ п/п	Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб. коп.	Задаток 20 %, руб. коп.
1.	**Лот № 17** – капитальные строения и прочее имущество:			
1.1	Здание столовой-заготовочной с инвентарным номером 110/ С-93065, площадью 1959,6 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**688 694,88**	**137 738,98**
1.2	Хозяйственный сарай №1 с инвентарным номером 110/С-102285, площадью 16,8 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**4 604,83**	**920,97**
1.3	Хозяйственный сарай №2 с инвентарным номером 110/С-102300, площадью 80,2 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/4, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**13 951,39**	**2 790,28**
1.4	Благоустройство с инвентарным номером 110/С-102283, площадью 4692,0 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**117 091,78**	**23 418,36**
1.5	Благоустройство (деревья) с инвентарным номером 110/С-102283	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**3 993,98**	**798,80**
1.6	Водопроводная сеть с инвентарным номером 110/С-102288, протяженностью 23,3 м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**340,03**	**68,01**
1.7	Канализационная сеть с инвентарным номером 110/С-102287, протяженностью 221,2 м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**1 202,11**	**240,42**
1.8	Передаточное устройство: низковольтная кабельная линия, инвентарный номер 050012 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО»	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3	**222,24**	**44,45**
1.9	Противопожарная сигнализация А16-512 № 29/07 АПС, инвентарный номер 100217 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО»	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3	**1 717,82**	**343,56**
	Итого:		**831 819,06**	**166 363,81**

Аукцион состоится **26 сентября 2016 в 14.00** по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21.09.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (80163): 47-63-80 – главный инженер Сергеева Леся Ивановна, 47-63-50, 47-65-17 – начальник ОКС Шамкуть Нина Михайловна.

ПА ЗАКОНАХ ВЕЧНАСЦІ

Хто скажа, навошта дзеля таго, каб трапіць у нейкае цікавае месца, трэба ставіць будзільнік на тры гадзіны раніцы? Каб пасля плесціся ў кухню, як здань? Адчайна змагаючыся са сном, чакаць кіпню, распырскваць яго вакол тэрмаса, нязграбнымі рухамі пераносіць ежу з дамашняга халадзільніка ў дарожны, а пасля здзіўляцца, куды падзеўся паштэт...
Бо кожная вылазка з зоны камфорту, як кажуць псіхолагі, не можа не абярнуцца знаходкай або адкрыццём. Гэтым разам я знайшла шмат супольнага ў філосафа з падарожнікам і адкрыла новы закон дыялектыкі.

Сюды едуць, каб убачыць скульптурны шэдэўр, роўны якому калі і знойдзецца, то не ў Беларусі.

3.38. Выходзім з пад'езда. У доме насупраць гарыць акно. У доме злева таксама адно свеціцца. І адно ў доме справа. Марына Цвятаева мела рацыю: у кожным доме ёсць адно акно, дзе не спяць. І нельга не падумаць пра тое, што і ў нашым доме толькі што гарэла акно. Цяпер яно патухла: мы выязджаем.

Гарэза Арчы (гэта наш навігатар, як памятаеце) важненька так заяўляе: «Праз пяцьсот метраў павярніце направа, пасля налева».

— Арчыбальд, а вось скажы нам, які сэнс паварочваць направа, каб пасля адразу павярнуць налева?

Калі нам трэці раз трапляюцца на шляху каровы, мы атрымліваем трохлітровік малака ў падарунак! Вандроўнікаў любяць. Асабліва такіх цікаўных.

Маўчыць, пракуда. Але я ведаю, што гэта ненадоўга. Проста абдумвае, як звесці нас у зман наступным разам.

За кальцавой туман. Дыханне зямлі. Ці пот?.. І цішыня наўкол — звонкая-звонкая. Нават праз шоргат колаў і гул матора чуеш яе, цішыню падарожнага ранку. І ўзнікаюць думкі самыя, бадай, натуральныя для чалавека, які едзе за сотні кіламетраў, каб зірнуць на адно надмагілле. Думкі пра тое, што самае гучнае ў свеце — цішыня, а самае праўдзівае — маўчанне. Бо соты раз прыходзіш да высновы: усё, што шэпча, грукае, звініць, рыпіць і неяк іначай пнецца, каб нарадзіць аргументы, — на самой справе нікчэмнае і незаўважнае. Цішыня — справа іншага кшталту. Яна не ад надзённага, нічога з ім агульнага не мае. Яна — гарантыя немітуслівай і грунтоўнай, упарадкаванай і нікому не падпарадкаванай вечнасці. Яе адзіная прыкмета — і яе спрадвечнае забеспячэнне...

Мы, значыцца, прагнем убачыць надмагілле Соф'і Пац, пра якую толькі і ведаем, што нарадзілася ў 1781-м, памерла ў 1856-м, з 1806 да 1811 года па прычыне шлюбу з Феліксам Патоцкім насіла прозвішча Патоцкая, а пасля ператварылася ў Несялоўскую, бо зноў пабралася шлюбам — з Францішкам Ксаверыем Несялоўскім. Што гэта дае нам для высвятлення асобы самой пані Соф'і, якая хаваецца ад нас пад трыма прозвішчамі адразу? Амаль нічога, акрамя таго, што больш за ўсіх яе любіла пляменніца, бо заказала ў Італіі ў майстра Джуліа Маскеці (Вікіпедыя такога не ведае) белае мармуровае надмагілле. Прывезлі яго з Італіі ў 1881-м, паставілі ў парафіяльным касцёле ў Росі, ля Ваўкавыска, і вось мы туды цяпер едзем, каб убачыць скульптурны шэдэўр, роўны якому калі і знойдзецца, то не ў Беларусі.

4.48. На полі пасвяцца каровы, з комінаў прыдарожных карчомак уецца дымок. На памяць прыходзіць — што б вы думалі? — закон двайнога адмаўлення, сфармуляваны Гегелем (як далёка сягнулі думкі!), са сваім прынцыпам развіцця як паўтору: што ёсць аўтазапраўкі, як не корчмы? І што ёсць ветрагенератары, якіх у іншых месцах сустракаецца процьма, калі не патомкі млыноў? Далібог, нічога з часу Сыракомлі не змянілася. Спадзяёмся, што і надмагілле Сафіі Пац ніколькі не пацярпела з гадамі, і мы ўбачым яго, Соф'ю, якой была яна, калі дапамагала згаданаму касцёлу, збудаванаму ў 1801-м, сваімі грашыма. Якой была ў сне.

У раёне Морына неверагодна хуткая сувязь з нябёсамі. Не паспелі сказаць: «Каб ты з'ехаў!» грузавічку-дальнабойшчыку, як ён саступіў нам шлях.

Ну вось і яна, Соф'я. Толькі-толькі заснула.

Мяркуючы па вышыні аблямаванай ці то бедфордскімі, ці то лільскімі, ці то малінскімі карункамі падушкі, збіралася прылегчы ненадоўга.

Пры дарозе спрэс крываўнік. Мільён крываўнікаў! Файны выраз, куды б яго прыстасаваць?..

5.15. Яшчэ адна чарада ў полі. Падобна на тое, што кароўкі тут начавалі, як і бачаныя папярэдне. Дзякуючы ім назіраем закон пераходу колькасных змен у якасныя: калі нам трэці раз трапляюцца на шляху каровы, мы атрымліваем трохлітровік малака ў падарунак! Вандроўнікаў любяць. Асабліва такіх цікаўных.

Пад промнямі ўзыходзячага сонца, атрымліваючы ад яго натхненне, працягваю ўслаўляць цішыню. Хто скажа, з якіх часоў штодня ўзыходзіць яно, сонца, над нашай прасторай? Хто ад тых часоў пачуў ад яго хоць бы крэкт? Хоць бы шолах ружовай коўдры, якую яно сцягвае з сябе кожную прыкмечаную чалавекам раніцу? Хто хоць калі зрабіўся сведкам сонечных пазяханняў ці ўздыхаў? Чые вушы ўлавілі сонечнае сакатанне ў клопаце пра новы дзень? Самае патрэбнае робіцца моўчкі. Самая вялікая праца не суправаджаецца каментарыямі з боку яе выканаўцы. Так і чалавек: працуе цяжка — працуе моўчкі. Сапраўды патрэбныя намаганні — нават калі на мяжы, праз пакуту, праз «не магу» — не нараджаюць стогнаў. І па выніках такіх намаганняў ніхто не плача пра неверагодную стомленасць, невыносны боль, нясцерпнае несусветнае непрызнанне. Бо вынік працы, калі яна патрэбна, наталяе сродкамі для лячэння і стомы, і болю, і якіх бы там ні было падазрэнняў на непрызнанне. Паводле, зноў жа, Гегеля, супярэчнасці існуюць унутры прадметаў і з'яў. Закон адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў. Само жыццё ёсць вялізная супярэчнасць — паміж нараджэннем і смерцю, калыскай і Божым ложкам. Апошні мы хутка ўбачым, бо пасля розных іншых аб'ектаў апынуліся ўжо ў касцёле.

Соф'ю Патоцкую-Несялоўскую-Пац (не выпадае гаварыць, што надмагілле) трэба шукаць у бакавым алтары. Але падыходзім да ксяндза — папрасіць дазволу для праваслаўных турыстаў і спытацца, дзе дакладна размешчаны аб'ект нашай цікавасці. Пазней у рысах ксяндза пазнаём Чэслава Паўлюкевіча, вядомага экзарцыста. Ён патрымае сваю руку на нашых галовах.

Ну вось і яна, Соф'я.

Толькі-толькі заснула. Прычым выпадкова, бо, мяркуючы па вышыні аблямаванай ці то бедфордскімі, ці то лільскімі, ці то малінскімі карункамі падушкі, збіралася прылегчы ненадоўга. Нечым, відаць, стомленая, але гэта якраз тая стомленасць, якая надыходзіць пасля ўсведамлення важкасці зробленай працы. Яшчэ прыкмета, што толькі прылегла: шаль з галавы не зняла. Накрылася пледам з махрамі. Паднесла руку да сэрца. Тонкую, у ажурнай манжэце. Сфатаграфаваць? Не хочацца. Няхай адпачне...

Мы не ведаем дакладна, якімі якасцямі валодала гэтая худзенькая жанчына, што мяняла мужоў і прозвішчы. Але хочацца верыць, што справы і думкі яе былі вартымі і касцёльных спеваў, і гэтай вось касцёльнай, пасля службы, цішыні. Бо не даецца такое за проста так.

А дамоў мы вернемся заўтра — напарадзе чакаюць іншыя «аб'екты». І хоць суткі — не такі вялікі тэрмін, ды ўсё ж за гэты час адбудзецца так шмат усяго-усялякага-рознага, што і самі мы зробімся іншымі, і свет вакол нас пераменіцца. Гэта новы закон дыялектыкі, адкрыты падчас падарожжа: закон расцяжнасці часу і трансфармацыі поглядаў.

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.

Здымкі рабіць не хацелася. Знайшліся ў калег. Траецкі касцёл знутры.

Паслядоўнікам

Калі вы, як і мы напачатку, не будзеце ведаць, у які храм у Росі трэба заходзіць, каб убачыць рарытэтнае надмагілле, зірніце на здымак, які суправаджае гэты артыкул, і проста запомніце знешні выгляд Троіцкага касцёла. Мы ж спачатку зайшлі ў крамку цераз дарогу — ніхто нам пра надмагілле не адказаў, паціснулі плячыма. Пасля ў аптэку зусім ужо побач, у агульным з касцёлам архітэктурным рашэнні, — і зноў адказу не атрымалі. Так вельмі часта бывае: жывучы ў месцы, дзе ёсць асаблівыя цікавінкі, імі асабліва не цікавішся. Які закон дыялектыкі спрацоўвае ў гэтым выпадку?

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

26 жніўня ў Зэльве адбудзецца знакаміты Ганненскі кірмаш, які сёлета прадугледжвае адкрыццё ўласнага музейнага пакоя і правядзенне канферэнцыі ў гонар 600-годдзя першай згадкі пра Дзярэчын. Што Дзярэчыну да Зэльвы ці наадварот? Там разбяромся!

Ці ведаеце вы, што ў Берліне ажно 170 музеяў? Вы ведаеце, што людзі ў тых музеях знаходзяцца ў вялікім захапленні? А дзе будзеце знаходзіцца вы, калі 27 жніўня а шостай вечара ўсе берлінскія музеі, галерэі і выставачныя залы, культурныя цэнтры і нават архівы адчыняць свае дзверы з нагоды «Доўгай ночы музеяў»?

1 верасня ў Рызе збіраюцца студэнты-першакурснікі, каб адзначыць... Дзень Арыстоцеля! Перад імі выступяць не толькі рэктар мясцовага ўніверсітэта і дэканы ўсіх факультэтаў, але і сам Арыстоцель. Калі вам цікава, што скажа аўтар вучэння аб прычынах і першапачатках усяго сутнага, паспяшайцеся ў Рыгу на плошчу ля Домскага сабора да сямі вечара.

3 верасня ў Анапе пачынаецца «Кінашок». Гэткі форум авангардных фільмаў, найноўшая (хоць ужо 24-гадовая) прыкмета тамтэйшага аксамітнага сезона. Цягнецца больш за тыдзень, знаёміць з працамі мэтраў і рознымі кінематаграфічнымі школамі. Прычына адпачынку, вартая таго, каб быць яго прычынай.

Фестываль сярэднявечных традыцый «Меч Лідскага замка» пройдзе толькі напрыканцы верасня, але збірацца на яго трэба цяпер: развучваць сярэднявечныя танцы, шыць адпаведную часу і месцу вопратку, адточваць майстэрства валодання мечам... Вы бачылі Лідскі замак у верасні? Нешта неверагоднае!

Яшчэ адзін рыцарскі фэст пройдзе 23-24 верасня ў Мсціславе. Сёлета гэтаму гораду 850 гадоў. Прынамсі, гэтулькі часу мінула з першай згадкі пра яго ў летапісах. Калі раптам, стаміўшыся ад шуму рысталішча, захочаце пашукаць помнік Пятру Мсціслаўцу, а вам розныя людзі будуць махаць рукамі ў розныя бакі, ведайце: такіх помнікаў у гэтым горадзе два — ля касцёла езуітаў і ля выканкама.

■ Беларусікі

МАЛЕНЬКАЯ МАДЭЛЬ

Фота Таццяны ВІРЭЙСКАЙ.

ЧАРГОВЫ здымачак на конкурс прыйшоў у рэдакцыю па электроннай пошце ад Антона Троцкага. *«Нашу маленькую беларусачку завуць Сафійка. Ёй 6 гадоў. Соф'я любіць спяваць, танцаваць, маляваць, а таксама дапамагаць маці па дому. Акрамя таго, яна займаецца харэаграфіяй і наведвае мадэльную студыю»*. Мы спачатку падумалі, што Антон — тата дзяўчынкі. Але, пасля таго як перапыталі, высветлілася, што брат. *«Я мама Соф'і, Святлана Троцкая са Жлобіна. Пішу з пошты сына, які цяпер служыць у арміі. У Соф'і з Антонам розніца 15 гадоў. Дзеці абажаюць адно аднаго, і дачушка вельмі чакае, калі брацік вернецца дамоў»*.

Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем і вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а мо нават і праўнукаў (з невялічкім, 4-5 сказаў, аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз.

А 4 верасня на Дні беларускага пісьменства ў Рагачове на звяздоўскім стэндзе ва ўсіх будзе ўнікальная магчымасць скінуць фотаздымкі ў «рэдакцыйны партфель» адразу ж з флэшкі ці з мабільнага тэлефона

■ Не прапусціце!

ФЕСТЫВАЛЬ МАРОЖАНАГА

Вы яшчэ не вырашылі, дзе правесці выхадныя ўсёй сям'ёй? Ёсць ідэя! У гэтую суботу ў Мінску пройдзе дабрачынны фестываль марожанага.

Дзе?
У сталічным гандлёвым цэнтры «Новая Еўропа» (вул. Сурганава, 57Б)

Калі?
27 жніўня з 12.00 да 17.00

Усяго на святе будзе прадстаўлена не менш за 60 гатункаў марожанага. За сімвалічнае ахвяраванне ўсе ахвотныя змогуць паўдзельнічаць не толькі ў яго дэгустацыі, але і ў розыгрышы цэлай скрынкі ласунку, прадастаўленай спонсарамі. Акрамя таго, на фестывалі будзе шмат разнастайных зон актыўнасці: тэматычная фотазона, аквагрым і іншыя. Кожны наведнік зможа спрычыніцца да конкурсу малюнкаў на тэму «Маё любімае марожанае». Лепшыя з іх будуць адзначаны прызамі і размешчаны на карпаратыўных сайтах кампаній-вытворцаў.

Атрыманыя на фестывалі сродкі пойдуць на добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол новага будынка дзіцячага хоспіса «Лясная паляна».

Надзея ДРЫЛА. *dryla@zviazda.by*

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СЕЗОН НАРЫХТОВАК

САЛАТЫ НА ЗІМУ



З кабачкоў

Спатрэбіцца: *кабачкі — 1,5 кг, перац балгарскі — 1 кг, цыбуля — 0,5 кг, памідоры — 1 кг, алей — 150 мл, цукар — 100 г, соль — 50 г, воцат — 100 г.*

Памідоры пракруціць на мясарубцы, астатнюю гародніну нарэзаць. Прыгатаваць марынад: змяшаць алей, цукар, соль, воцат. У кіпячы марынад класці па чарзе, першымі кабачкі. Паварыць 5 хвілін, памешваючы. Затым цыбулю. Таксама паварыць 5 хвілін. Далей перац балгарскі і праз 5 хвілін памідоры. Усё паварыць яшчэ 10 хвілін, не забываючы памешваць. Выкласці ў стэрыльныя слоікі і закатаць.

З агуркоў

Спатрэбіцца: *3 кг агуркоў, 200 г часнаку, 250 г цыбулі, 100 г солі, 250 г цукру, 150 г воцату.*

Агуркі нарэзаць на скрылікі таўшчынёй 0,5-1 см. Дадаць нарэзаную тонкай саломкай цыбулю і дробна нарэзаны або прапушчаны праз прэс часнок. Усё старанна змяшаць і заправіць цукрам, соллю і воцатам. Пакінуць у халаднаватым месцы на 12 гадзін, пасля проста скласці агуркі ў слоікі і закатаць. Захоўваць у халаднаватым месцы.

Дары восені

Спатрэбіцца: *па 1,5 кг памідораў і агуркоў; па 1 кг цыбулі, морквы, перцу; 7 ч. л. солі, 20 ч. л. цукру, 10 ст. л. воцату, 20 ст. л. алею.*

Гародніну нарэзаць і змяшаць з соллю, цукрам, воцатам і алеем. Пакінуць мінімум на 30 хвілін для таго, каб яна пусціла сок. Пасля яшчэ раз перамяшаць, раскласці па слоіках разам з сокам, які ўтварыўся. Стэрылізуем салату 10 хвілін. Закатваем і ўкручваем да поўнага астывання.

Грузінская

Спатрэбіцца: *3 кг агуркоў, 2 кг памідораў, 1 кг салодкага перцу, 200 г часнаку, 3 ст. л. солі, 0,5 шклянкі цукру, 1 шклянка алею.*

Балгарскі перац і памідоры парэзаць дробна. Дабавіць соль і цукар. Паставіць на агонь і варыць 20 хвілін. Парэзаць агуркі на паўскрылікі. Часнок здрабніць. Праз 20 хвілін у каструлю дадаць агуркі і паварыць 5 хвілін. Дадаць алей і часнок. Гарачую салату раскласці па слоіках, у кожны дадаць па 1 ч.л. воцату. Закатаць накрыўкамі і ўкруціць да поўнага астывання.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

ТАННА І ПРЫГОЖА

Куды падзець рэшткі шпалер?

Вельмі часта пасля рамонту застаюцца абрэзкі і рэшткі шпалер, якія можна выкарыстаць для дэкаратыўных мэтаў. Таксама можна купіць у краме апошнія рулоны, якія звычайна прадаюцца са значнымі зніжкамі.

Самы эфектны спосаб спажыць рэшткі шпалер — зрабіць сцяну ў стылі пэчварк: нарэзаць квадратныя кавалкі з трох і больш відаў шпалер і наклеіць у адвольным парадку.

Можна выкарыстоўваць іх і лакальна — напрыклад, абклеіць унутраныя часткі адкрытых шафаў. Атрымаецца выдатны дэкаратыўны фон для кніг і цацак. Прычым, што ўдвая добра, на фон падыдзе любы малюнак — хоць кветкі, хоць палоска.

Невялікім кавалкам шпалер можна дэкараваць пацёртыя дзверы, вылучыць сцяну за ўзгалоўем ложка або абедзенную зону. Выражце з рэшткаў шпалер кругі, палосы, зоркі, сілуэты звяроў і наклейце на белы фон.

Сімпатычныя матылькі для дэкору сцен можна зрабіць са шчыльнага кардону і абклеіць кавалачкамі рознакаляровых шпалер. Такімі матылькамі можна ўпрыгожыць як дзіцячы пакой, так і гасцёўню.

Скарагаворкі па-беларуску

Лаўрэн лавіў рыбу, Лара варыла рыбу з лаўровым лістом.

☺ ☺ ☺

Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ.

☺ ☺ ☺

Пароль — «Арол».

☺ ☺ ☺

І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу.

☺ ☺ ☺

Мама з Мілай мылі раму.

☺ ☺ ☺

Скача чапля па балоце, чачотачка ў чароце,
А чубаты чачот топча, топча агарод.

☺ ☺ ☺

Вадавоз вёз ваду ад вадаправода.

☺ ☺ ☺

Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакунку.

☺ ☺ ☺

Рабая курка клюе крупкі.

☺ ☺ ☺

Белы бусел баяў байку беламу зайку.

☺ ☺ ☺

На двары стары баран грукаў зранку ў барабан.

☺ ☺ ☺

Боб ды боб — два бабы, а яшчэ боб — тры бабы.

☺ ☺ ☺

Пракоп і Барыска елі барбарыскі.

■ Зялёная аптэка

Якія зёлкі збіраць у верасні

Да канца лета засталіся лічаныя дзянькі. Але і восенню можна смела працягваць запасацца зёлкамі. Што ж трэба збіраць у верасні? Па адказ на гэтае пытанне мы звярнуліся да гаспадыні аграсядзібы «Хорань» (месціцца ў Расонскім раёне) Алы ХОРАНЬ, якая робіць гарбатку нават для Італіі.

Вось пералік зёлак, якія рэкамендуецца збіраць у першы месяц восені.

✓ Валяр'яна лекавая — карэнішчы з каранямі.
✓ Драсён змяіны — карэнішчы з каранямі.
✓ Дзягіль лекавы — карэнішчы з каранямі.
✓ Каляндула лекавая — суквецці.
✓ Каліна звычайная — кара, плады.
✓ Журавіны — плады.



✓ Крапіва двухдомная — лісце.
✓ Лопух вялікі — карані.
✓ Ядловец звычайны — шышкаягады.
✓ Дзьмухавец лекавы — карані.
✓ Вольха шэрая — шышкі.
✓ Шыпшына карычная — плады.
✓ Крушына слабіцельная (жостцер) — плады.
✓ Дуброўка прамастаячая — карэнішчы.
✓ Шчаўе конскае — карэнішча і карані.

Лісце рэкамендуецца збіраць у сухое і сонечнае надвор'е, пасля таго, як высахне раса (з 9 да 16 гадзін). Плады і ягады — раніцай ці позна ўвечары і толькі спелыя.

Сабраныя зёлкі трэба старанна высушыць, затым скласці на захоўванне. У далейшым вы заўсёды зможаце скарыстацца сваім каштоўным запасам для прыгатавання карысных настояў і адвараў

ЗНАЧНА ЛЯГЧЭЙ СТАЦЬ БАЦЬКАМ, ЧЫМ ІМ ЗАСТАЦЦА (Васіль Ключэўскі).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

ЯДНАННЕ НЕБА І ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У навучальных установах праводзяцца ўрокі беларускага пісьменства. Сёлета ў аўдыторыях Баранавіцкага і Гомельскага ўніверсітэтаў адбудуцца навукова-духоўна-творча-асветніцкія канферэнцыі. Сустрэчы ў працоўных калектывах, у сацыяльных прытулках, бальніцах, інтэрнатах... Сорак асветнікаў. Група духоўнага суправаджэння і вучоныя, пісьменнікі, журналісты, педагогі, кіраўнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, кампазітары, мастакі, народныя майстры...

Экспедыцыя — арганічная састаўная частка Дня беларускага пісьменства — з 1998 года праходзіць у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта аб святах і святочных днях. За 22 гады экспедыцыя наведала больш як 600 храмаў Беларусі, у больш як 300 святынях пакінулі ў падарунак фотаспісы цудатворнай Загор'е-Сталавіцкай іконы Пакрову Прасвятой Багародзіцы. Гэтая старажытная ікона была знойдзена вясной 1983 года каля вёскі Загор'е Баранавіцкага раёна, калі пачаліся земляныя работы на месцы былых праваслаўных могілак.

— *Уражваюць сустрэчы з тымі жыхарамі населеных пунктаў, якія не могуць паўдзельнічаць у сумесным хрэсным ходзе, — расказвае Ніна Загорская. — Уражваюць і нас, і мясцовых жыхароў, якія вельмі чакаюць. Так, у Петрыкаве мы наведвалі папраўчую калонію для дзяўчат ад 14 да 18 гадоў. Тады ў складзе экспедыцыі быў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дацэнт Акадэміі музыкі кларнетыст Генадзь Забара. Дзяўчаты, што прысутнічалі на сустрэчы, тады ўпершыню пачулі жывую класічную музыку. Сядзелі, як зачараваныя, прасілі сыграць яшчэ.*

А неяк у Жыткавічах эспедыцыя наведала школу-інтэрнат. Калі ўдзельнікі зайшлі ў будынак, выхаванцы ўстановы сваволілі, біліся партфелямі. Але калі госці пакідалі сустрэчу — дзяцей нібыта падмянілі, яны сталі вельмі спакойнымі і паслухмянымі.

Ніна Загорская тлумачыць:

— *Калі нязмушана нясеш асвету, духоўнасць, сустрэча з ёй мацней уздзейнічае на свядомасць аўдыторыі. Мы бачым, як людзі прасветлена ідуць за Дабрадатным Агнём, за непагаснай лампадай. Наш аўтобус — гэта перасоўны храм і перасоўная акадэмія: у экспедыцыі з намі традыцыйна едуць многія вучоныя, прадстаўнікі НАН Беларусі. У ранейшыя гады ў паездках прымалі ўдзел вядомыя ў краіне людзі. Гэта, напрыклад, гісторык, пісьменнік Мікола Ермаловіч, яго брат Валянцін, выдатны рэжысёр, паэтка Анэля Тулупава (манахіня Неаніла), народная артыстка СССР Аляксандра Клімава, пісьменнікі Алесь Махнач, Браніслаў Спрынчан, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Міхась Біч і многія-многія іншыя. На жаль, іх ужо няма на гэтым свеце, але паломнікі памятаюць і штогод падчас вандроўкі моляцца за супакой іх душаў.*

Сёлета «Шлях да Святыняў» пройдзе пад духоўным акармленнем і з асабістым удзелам Веніяміна, епіскапа Барысаўскага і Мар'інагорскага. Галоўным захаванцам Непагаснай Лампады Духоўнасці з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга будзе Сергій Гардун, протаіерэй Свята-Духава кафедральнага сабора, кандыдат багаслоўя, прафесар Мінскай духоўнай акадэміі. Захавальнікамі Дабрадатнага Агню благаслаўлёны таксама протаіерэй Аляксандр Пачопка, настаяцель храма Мікалая Цудатворца, што ў вёсцы Вялікая Ухалода Барысаўскага раёна і іерэй Дзмітрый Ворса, настаяцель храма навамучаніка Уладзіміра Хіраскі.

Жаданыя ва ўсіх аўдыторыях сустрэчы з паэтамі Міхасём Башлаковым, Вадзімам Спрынчанам, літаратуразнаўцамі Зінаідай Драздовай, Ігарам Шаладонавым, пісьменнікам і грамадскім дзеячам Анатолем Бутэвічам (Максімам Валошкам), кампазітарам Ларысай Скроцкай-Махнач і многімі іншымі выдатнымі творцамі і асветнікамі.

— *Сустрэчы ў аўдыторыях — гэта адно, а хрэсны ход, які праходзіць у кожным месцы, якое наведвае экспедыцыя, агні, званы, харугвы — іншае. Гэта яднанне неба і зямлі,* — **дзеліцца ўражаннямі Ніна Загорская**. — *Можна гаварыць у розных аўдыторыях, праводзіць канферэнцыі, але нішто не параўнаецца з адчуваннем таго, як усё больш і больш людзей розных канфесій сыходзяцца разам па дарозе ў храм. Нават нягледзячы на тое, што «Дарога да Святыняў» адбываецца ў час, калі людзі ўжо пачынаюць бульбу капаць. Хрэсны ход большае, большае, да нас далучаюцца ўсё новыя і новыя людзі. Часам назіраем і цуды прыроды: надвячоркам сонца «становіцца крыжам» над месцам сустрэчы ці з'яўляецца вясёлка.*

Экспедыцыя на Святым полі каля вёскі Загор'е пад Баранавічамі.

Маршрут сёлетняй вандроўкі «Дарога да Святыняў»: Мінск, Свята-Духаў кафедральны сабор — магілка святой блажэннай Валянціны Мінскай каля вёскі Крысава (Дзяржынскі раён) — Святое поле каля вёскі Загор'е Баранавіцкага раёна — Баранавічы — пасёлак Чырвоная Слабада (Салігорскі раён) — пасёлак Акцябрскі, вёска Красная Слабада (Акцябрскі раён) — пасёлак Азарычы (Калінкавіцкі раён), Калінкавічы — Гомель — мемарыяльны комплекс «Аперацыя «Баграціён», пасёлак Парычы (Светлагорскі раён), Светлагорск — Жлобін — Рагачоў, сталіца Дня беларускага пісьменства.

Сустракаць экспедыцыю прыходзяць людзі ўсіх узростаў.

Сёлета экспедыцыю «Дарога да Святыняў» упершыню ўзначаліць літаратуразнаўца Алесь ЛАПАТА-ЗАГОРСКІ. Ён расказаў:

— Ёсць раёны, куды вельмі часта наведваюцца госці. А ёсць тыя, што чамусьці абмінаюцца ўвагай. Напрыклад, калі мы былі ў Дрыбінскім, Ляхавіцкім раёнах, неаднаразова чулі словы ўдзячнасці мясцовых жыхароў і шкадаванне пра тое, што іх мясціны часцей абмінаюць, чым наведваюць. Дзеля гэтага варта патраціць час і сілы, праехаць у экспедыцыі, бо людзі чакаюць. Таму, прапрацоўваючы маршруты, улічваем іх «запатрабаванасць» гасцямі, пісьменнікамі. Часам мясцовыя краязнаўцы неверагодна радуюцца, кажуць: мы думаем, што мы дзіўныя, адзінкавыя людзі, раз цікавімся нашай спадчынай, мінуўшчынай, але пабачыўшы вас пераконваемся, што гэта з'ява. Што мы разам. Варта падтрымаць тых, хто працуе на ніве нашай гісторыі, культуры, духоўнасці. Таксама падчас паездак можна вырашыць пытанні мясцовага характару. Так, неяк у Навагрудскім раёне мы пачулі, што ў іх прапаў валун, а ў Баранавіцкім нам сказалі, што валун аднекуль з'явіўся. Частачкі мазаікі складваюцца ў адно цэлае.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Удзельнікі вандроўкі «Дарога да Святыняў» на месцы пахавання беларускай пісьменніцы Цёткі.

Можа падацца, што «Дарога да Святыняў» — акцыя толькі духоўнага, праваслаўна-рэлігійнага кшталту. Пра гэта сведчаць сталыя рысы: іконы, хрэсныя ходы, Дабрадатны Агонь ад Гроба Гасподняга, малітвы... Але ж гэта не зусім так. Гэтая дарога — сімвал яднання людзей, паглыблення духоўнасці, веры ў дабрыню і чалавечнасць. Гэта — агульначалавечыя каштоўнасці, на развіццё якіх і працуе беларускае пісьменства, тыя, хто нясе сваёй працай слова, кнігу як знак культуры, запавет для нашчадкаў і расповед пра нас, сённяшніх. Дык няхай жа знакамі часу застанецца агульнае Свята пісьменства, светлая «Дарога да Святыняў» і зялёныя Сады Малітвы — хай, можа, малітвы не заўсёды кананічнай, але шчырай, гарачай... А гэта залежыць ад чысціні душы і сэрца кожнага чалавека.

■ Экслібрыс «Звязды»

«...Вечны гаспадар маёй душы»



Добры дух зямлі дняпроўскай...: Рагачоўшчына літаратурная / Уклад. Міхася Казлоўскага. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. — 366 с.

На першы погляд немагчыма нават уявіць, які падыход да ўкладання зборніка твораў розных аўтараў мог бы дазволіць чытачу пабачыць пад адной вокладкай і прозу нашых пачынальнікаў Ластоўскага і Кіркора; і ўрыўкі з твораў карыфеяў — Караткевіча і Макаёнка; і апавяданні сучаснікаў-традыцыяналістаў Слівы і Ткачова; і вершы прадстаўніц зусім новага пакалення айчыннай паэзіі — Кудасавай і Чумаковай. Не, гаворка не ідзе пра літаратурна-мастацкі, ці, як кажуць «тоўсты» часопіс. Такі шырокі спектр аўтараў, жанраў эпох, прадстаўленых у кнізе, можна патлумачыць хіба што рэгіянальнасцю.

Усе згаданыя творцы (а да іх ліку далучаюцца яшчэ многія і многія постаці) ці нарадзіліся на Рагачоўшчыне, ці правялі тут пэўны час і, натхнёныя маляўнічымі дняпроўскімі краявідамі, прысвяцілі гэтым мясцінам свае творы. Таму не выпадкова новы зборнік серыі «Беларусь літаратурная» яднае столькі розных аўтараў. Дзіўна нават: паміж імі — дзесяцігоддзі і нават стагоддзе, прорвы ў творчых падыходах і прынцыпах пісьма, але ў фізічнай адлегласці гэтая розніца вызначаецца толькі межамі Рагачоўскага раёна.

У літаратуразнаўстве існуе такое паняцце, як genius loci, ці дух месца. Лічыцца, што адны і тыя ж мясціны, апісаныя рознымі аўтарамі, у творах могуць набываць агульныя рысы, быць падобнымі, нават тоеснымі. Так, нібы само месца дыктуе мастаку радкі, вобразы, скіроўвае на выказванне думак у пэўным стылі. Натуральна, гэтая тэорыя часцей за ўсё звязаная з урбанізмам — адлюстраваннем гарадоў у раманах, вершах, стварэннем новай літаратурнай міфалогіі пэўнага горада. Але, думаецца, не будзе памылкай і спроба пабачыць гэтага ж духа і на больш шырокім абшары, напрыклад, у межах аднаго з раёнаў краіны. Якім жа тады паўстане перад намі дух Рагачоўшчыны?

Вольным і смелым — як Гервасій Выліваха, герой караткевічаўскай «Ладдзі Роспачы»; рамантычным, падчас сентыментальным — як лірычныя героі песень Аляксея Зарыцкага і вершаў Ніны Пінчук; сур'ёзным і строгім — як літаратурна-крытычныя артыкулы Алены Васілевіч; смешным і гарэзлівым — як героі вершаў Міколы Чарняўскага для дзяцей. Але, калі прыгледзецца, кожны з аўтараў, адлюстроўваючы агульныя рысы «твару» Рагачоўшчыны, дамалёўвае і свае штрышкі да партрэта гэтых мясцін.

Укладальнік кнігі «Добры дух зямлі дняпроўскай...» вядомы краязнаўца з Маладзечна Міхаць Казлоўскі паклапаціўся пра тое, каб гэтае выданне было не проста канстатацыяй фактаў для аматараў літаратуры, але і пэўнага кшталту адкрыццём для кожнага з нас. Мы тут бачым як вядомыя і любімыя імёны Міхася Лынькова, Міколы Купрэева, Пятра Васілеўскага, Віктара Яраца, так і параўнальна новыя — Андрэя Паўлухіна, Уладзіміра Шпадарука, Уладзіміра Немізанскага.

Дарэчы, радок, які я вынесла ў загаловак, належыць пяру паэткі з Рагачова Насты Кудасавай. Хоць піша яна ў вершы «Дні сплываюць, бы са сценаў цені...» зусім не пра родныя мясціны і не пра дух горада (а, натуральна, пра каханне). Мне падумалася, што менавіта гэтыя словы як мага лепш падыходзяць да апісання пачуццяў, што мы маем да любімых краявідаў. Там не абавязкова нарадзіцца, але важна ўразіцца, натхніцца і, магчыма, запомніць на ўсё жыццё

Матэрыялы падрыхтавала Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

■ Навіны кампаній

ПОЛЬСКІЯ ЦЯГНІКІ САБЕ, А ТРАКТАРЫ Ў ІНДАНЕЗІЮ

НОВАЯ ТЭХНІКА ПАСПЯХОВА ПРАЙШЛА ВЫПРАБАВАННІ

Малагабарытны трактар «Беларус-421» вытворчасці Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў за першыя два месяцы лета паспяхова прайшоў праверку ў выпрабавальным цэнтры міністэрства сельскай гаспадаркі Інданезіі ў горадзе Тангеранг. Тэсты праходзілі на працягу 5 тыдняў і ўключалі ў сябе стэндавыя выпрабаванні на адпаведнасць дзеючаму ў Інданезіі стандарту, гаспадарчыя выпрабаванні ў рэальных умовах эксплуатацыі на цвёрдых глебах і аналагічныя выпрабаванні на глебах павышанай вільготнасці.

